Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 21 1933 г. СУБОТА № 233 (4777)

Год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Прафсаюзы слаба перабудавалі сваю работу.

Ганаровае месца ў кастрычніцкай дэманстрацыі павінна належыць перадавым прадпрыемствам, выканаўшым план па ўсіх паказальніках.

Дапаможам ударнікам спаткаць кастрычніцкія святы ў адрамантаваных кватэрах.

БССР выканала 84,1 проц. плана адгрузкі бульбы Ленінграду.

Ушацкае кіраўніцтва патурае кулацкім антыкалгасным тэндэнцыям.

БАЙКАЧОЎ — Палітычныя сляпцы.

ЗА МЯЖОЙ:

ФРЫЦ ГЕККЕРТ — Фашысцкае ашуканства.

На парозе ўрадавага крызіса ў Японіі.

ПРАФСАЮЗЫ СЛАБА ПЕРАБУДАВАЛІ СВАЮ РАБОТУ

На IX з'ездзе прафсаюзаў тав. **Каганові**ч сказаў: **«Зарплата, нармаванне працы, пытанні снабжэння, пытанні жылбудаўніцтва—гэта тыя асноўныя звенні, за якія пролетарыят і яго партыя маюць права патрабаваць з саюзаў больш, чым за які-небудзь іншы ўчастак прафработы».** Вырашаючы гэтыя пытанні, прафсаюзы тым самым увязваюць канкрэтныя патрэбы рабочых з інтарэсамі сацыялістычнай прамысловасці. А гэта асноўная задача прафсаюзнага руху на цяперашнім этапе. **Не займацца вытворчасцю наогул, а браць канкрэтныя [illegible] работы.**

[illegible]умоўна, што прафсаюзы БССР [illegible] адносінах дабіліся некаторага пералому. Пасобныя ЦК саюзаў і ФЗМК сталі больш-менш канкрэтызаваць сваю работу. Але ў цэлым па рэспубліцы прафсаюзная работа цалёка яшчэ не перабудавана так, як гэтага патрабуюць пастановы IX усесаюзнага і VII усебеларускага з'ездаў прафсаюзаў. І калі прамысловасць БССР з квартала ў квартал не выконвае вытворчай праграмы, то ў гэтым значная доля віны кладзецца і на прафсаюзы па чале з цэнтральным советам.

У чым канкрэтна заключаецца іх віна? Перш за ўсё ў тым, што такія важныя пытанні, як тэхнармаванне і зарплата, яшчэ не сталі ў цэнтры ўвагі ні самога ЦСПСБ, так і ЦК саюзаў, не гаворачы ўжо аб нізавых звеннях. Праўда, з фармальнага боку як быццам усё ў парадку. Амаль усюды пры ЦК і ФЗМК існуюць аддзелы і тэхнармавання і зарплаце, у якіх [illegible] людзі і фармальна адказваюць за гэты ўчастак работы.

Але гэтыя аддзелы і людзі, што ядзяць у іх, ка сутнасці штампуюць тое, што робяць гаспадарнікі, забываючы аб тым, што адказнасць за правільную арганізацыю сістэмы зарплаты і тэхнармавання ўскладаецца на прафсаюзныя арганізацыі.

Падойдзем да канкрэтных фактаў і «жывых людзей». Возьмем ЦК саюза **дрэваапрацоўшчыкаў** (старшыня т. **Міруц**). Як стаіць справа з тэхнармаваннем дрэваапрацоўчай прамысловасці, якая ў Беларусі займае даволі значнае месца? Вельмі і вельмі дрэнна. Па сутнасці ў ёй, тэхнармавання ў поўным сэнсе гэтага слова няма. Нормы і расцэнкі на работу ўстанаўліваюцца на аснове так званага «арыфметычнага сярэдняга». Больш таго, дапускаецца грубае скажэнне палітыкі зарплаты.

Вельмі характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца **бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат.** Там справа дайшла да таго, што расцэнкі на тумбачкі ўстанаўліваліся для кожнага рабочага асобныя. У выніку рабочыя адной і той-жа кваліфікацыі атрымлівалі розную зарплату. І не таму, што адны больш, а другія менш выпрацоўвалі, а таму, што расцэнкі былі ўстаноўлены няправільныя. Заўком аб гэтым ведаў і лічыў такое з'яўшча зусім нармальным. Бывалі на камбінаце і інжынерна-тэхнічныя работнікі ЦК саюза і таксама не надавалі ніякага значэння гэтаму факту.

Дрэваапрацоўчая прамысловасць, у якой дрэнна стаіць справа з тэхнармаваннем, не адзінкавы прыклад. У **металлаапрацоўчай** таксама на цэлым радзе буйных прадпрыемстваў зусім няма тэхнічна ўгрунтаваных норм. Узяць хоць-бы такія заводы, як **«Комунар»** (Менск) і **«Пролетарый»** (Гомель). Не глядзячы на тое, што па сваім тэхнічным абсталяванні яны стаяць на даволі высокім узроўні, тэхнічных норм там зусім няма. На «Комунары» ў пачатку года ў ліцейным цэху ўстанавілі тры тэхнічныя нормы. Але так іх «угрунтавалі», што праз тыдзень прышлося ліквідаваць, бо ні адзін рабочы іх не выконваў. Між тым у заводскім ТНБ працуе каля 10 чалавек інжынераў і тэхнікаў. Нямала можна сустрэць і фактаў, калі тэхнічныя нормы ўстанаўліваюцца вельмі нізкія.

Галавацяпскія нормы ліквідавалі і больш гэтым пытанням ТНБ рашыла не займацца. Не займаўся ім і заўком. Але больш за ўсё характэрна, што ЦК саюза металістаў і сектар зарплаты ЦСПСБ аб гэтым ведаюць і ніякіх мер не прымаюць. Трэба проста сказаць, што ЦСПСБ пытаннямі тэхнармавання і арганізацыяй зарплаты сур'ёзна і глыбока не займаецца. Гэтыя пытанні расплываюцца ў агульных пытаннях кіраўніцтва вытворчасцю. Работай прамысловасці ЦСПСБ займаецца наогул, таксама як і паркаматы, а галоўнае, за што прафсаюзы адказваюць у першую чаргу, у цэнтр увагі не ставіцца.

Ці можна мірыцца з такім становішчам? Ні ў якім выпадку. Прафсаюзы Беларусі павінны рашучым чынам пакончыць з агульным канцылярска-бюракратычным падыходам да пытанняў вытворчасці. **Для ЦСПСБ, ЦК саюзаў, ФЗМК няма наогул вытворчасці, а ёсць канкрэтныя ўчасткі, на якіх трэба сканцэнтраваць увагу, змагаючыся за паспяховае выкананне прамфінплана.**

Так, і толькі так трэба ставіць пытанне і патрабаваць ад прафсаюзаў рашучай перабудовы сваёй работы на аснове лозунга **«тварам да вытворчасці».**

Адным, было-б няправільна зводзіць сутнасць гэтага лозунга выключна да пытанняў тэхнармавання і зарплаты. Снабжэнне і жыллё рабочых таксама павінны стаяць у цэнтры ўвагі прафсаюзаў. А як змагаюцца прафсаюзныя арганізацыі за снабжэнне рабочых? Вельмі слаба. Калі веснавая сяўба ў казгасах была правезена большмення здавальняюча, то ўборка прахадзіць надзвычай слаба. Зіма набліжаецца, а па полі яшчэ не ўборкны дзесяткі тысяч га бульбы.

Што-ж прадпрынялі ЦСПСБ і ЦК саюзаў, каб ліквідаваць гэты прарыў? Апрача шматлікіх пастаноў і пасылкі нізавым звенням папераджальных цыркуляраў — нічога. Не канцылярска-бюракратычнай пісанінай трэба да памагаць нізавым арганізацыям, а жывым, канкрэтным і аперацыйным кіраўніцтвам.

А гэтага яшчэ пакуль што няма. Няма таму, што ў апараце ЦСПСБ і ЦК саюзаў ёсць шмат бюракратаў і чыноўнікаў, якія зжыліся з канцылярска-бюракратычнымі метадамі работы і наперакор дырэктывам партыі не жадаюць адмовіцца ад іх.

Чыстка партыйнай арганізацыі ЦСПСБ, якая на днях пачнецца, павінна выкрыць гэтыя бюракратычныя і чыноўніцкія элементы.

Асобна трэба спыніцца на пытанні перадачы функцый соцстраха прафсаюзам. У гэтай галіне работа таксама праходзіць даволі марудным тэмпамі, асабліва па невытворчых саюзах. Узяць, напрыклад, саюзы працаўзетаў і РДУ. На гэтых саюзах толькі што пачынае праводзіцца работа. Выплатныя пункты пры мясцовых яшчэ нідзе не арганізаваны.

На мясцах ёсць шмат няяснасцяй і непаразуменняў. Невядома, напрыклад, ці будуць арганізоўвацца выплатныя пункты пры сельсоветах, якія маюць свае сельскія бюджэты. Няма па мясцах неабходных інструкцый і справаздач. На запытанні мясцкомаў ЦК саюзаў упарта не адказваюць.

Чым тлумачыцца такая марудлівасць? Галоўная прычына заключаецца ў тым, што ў радзе месц прафсаюзныя арганізацыі абмежаваліся правядзеннем прафдня. Мала растлумачылі рабочым значэнне зліцця функцыі соцстраха з прафсаюзамі. Трэба практычна арганізоўваць гэтыя функцыі непасрэдна на прадпрыемствах. А гэта работа вымагае канкрэтнай дапамогі цэнтральных арганізацый нізавым звенням.

Толькі большэвіцкая самакрытыка, рашучае выкараненне бюракратызма з апарата могуць забяспечыць неабходны пералом у рабоце прафсаюзаў.

Аб падрыхтоўцы кіруючых калгасных кадраў

З пастановы ЦК КП(б)Б

У мэтах разгортвання падрыхтоўкі кіруючых калгасных кадраў: старшынь калгасаў, загадчыкаў таварных ферм, брыгадзіраў паляводчых і жывёлагадоўчых брыгад, ЦК КП(б)Б пастанавіў арганізаваць раённыя стацыянары, калгасныя школы ў Капыльскім, Мазырскім, Дрысенскім, Бабруйскім, Магілёўскім, Спуцкім, Менскім, Дзяржынскім, Рагачоўскім, Аршанскім, Гомельскім, Віцебскім і Горацкім раёнах.

Адказнасць за арганізацыю школ усладзецца на Наркамзем, райкомы КП(б)Б і райвыканкомы.

У калгасныя школы павінны быць прыняты сапраўды ударнікі — калгаснікі з комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных актывістаў.

Адбірае слухачоў у школу мандатная камісія пры райкоме КП(б)Б па рэкамендацыі палітаддзела ці ячэйкі КП(б)Б.

ХОД ЧЫСТКІ МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

У МЕНСКУ ПА 20 КАСТРЫЧНІКА ЧЫСТКА АДБЫВАЕЦЦА Ў 21 ЯЧЭЙЦЫ, СЯРОД ЯКІХ НАСТ. ЯЧЭЙКІ: НАРКАМЗЕМА, НКЛЕГПРАМА, МТМ, БЕЛДЗЯРЖСНАБА, ВКСГП, ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА БЕЛАРУСІ, РЭДАКЦІЯ «ЗВЯЗДА», ТОРФМЕЛАРАЦЫЙНАГА ФАКУЛЬТЭТА, ФІЗКУЛЬТУРТЭХНІКУМА.

ЗАКОНЧЫЛАСЯ ЧЫСТКА ЯЧЭЕК: НКАСВЕТЫ, ГАЛОЎДАРТРАНСА. 21 КАСТРЫЧНІКА ПАЧЫНАЕЦЦА ЧЫСТКА ПАРТЯЧЭЙКІ ПРЫ СНК БССР. ПРАВЕРКА ПАРТЫЙЦАЎ СКОНЧАНА Ў 204 ЯЧЭЙКАХ. УСЯГО ЧЫСТКАЙ АХОПЛЕНА 225 ЯЧЭЕК.

ПА МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЧЫСТКУ ПРАЙШЛІ НА 20 КАСТРЫЧНІКА 7.247 ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ПАРТЫІ—71,6 ПРОЦ.

МЕНСКАЯ ГАРКАМСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

СКАНЧЭННЕМ ЗЯБЛІВА Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ЗАВАЮЕМ ПРАВА НА ЎДЗЕЛ У КАСТРЫЧНІЦКІМ ЗЛЁЦЕ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ

За права паслаць дэлегатаў на кастрычніцкія святы ў Менск

СПАБОРНІЦТВА БРЫГАД У КАЛГАСЕ „ТРУДАВІК"

ВЫНІК ПЕРШАГА ДНЯ

БРЫГАДЗІР МІНЧАНКА ЎЗЯЎ ПЯРШЫНСТВА

ЛЁЗНА. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Першы дзень спаборніцтва брыгад у калгасе «Трудавік» прынёс эрухі ў рабоце. Разам з тым выявіліся буйнейшыя недахопы, якія трэба выправіць на ходу.

Умела і трапна арганізаваў работу брыгадзір першай брыгады тав. **МІНЧАНКА,** які выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва ўсіх астатніх брыгадзіраў.

У першай брыгадзе ідзе зяблева. Тав. Мінчанка расставіў сілы па звеннях. Гэта дало свае вынікі. Нормы на зяблеву перавыконваюцца. Дагэтуль, калі працавалі ўсе разам на параконным плузе, узорвалі 0,35 га ў дзень, зараз, пасля разбіўкі на звенні, узорваюць 0,60 — 0,70 га.

Няўменне расставіць сілы, арганізаваць работу, ігнараванне якасці — вось што выявілася ў першы дзень спаборніцтва ў брыгадзе № 2 (брыгадзір **ЦЫГАНКОЎ ТРАФІМ).**

— Ці зяблеце? — запыталі ў Цыганкова.

— Не, нічога, апроч малацьбы, не робім. Людзей не хапае,—адказвае Цыганкоў.

Ці так гэта? Каб пераканацца, прасочым, што робіцца на таку, дзе працуе паўскладаная малатарня. Замест 18-20 чалавек як максімум, тут занята 29. Як-жа яны распаўлены?

Малыціна стаіць ля тока. А ў таку — ажёс. На «падрыхтоўцы» аўса да пераноскі працуюць 4 дзяўчыны. Ім рабіць абсалютна няма чаго.

Зараз паглядзім, што робіцца каля барабана і за сталом малыціны. Барабанчык Казакоў сапраўды працуе — ён раўніе авёс, падае ў малыціну. Акрамя Казакова за сталом яшчэ 3 чалавекі. Ім цесна, яны адзін другому перашкаджаюць, яны ледзь рухаюцца, бо баяцца, каб з-за цеснаты не скінуць каго на зямлю. Чырвонапольскі калгаснік Ксяндзоў ледзь паварачваецца і памінутна стаіць без работы, бо няма чаго яму тут рабіць. Ля стала смела можна скараціць аднаго чалавека.

Ля малатарні прагульваецца малыцінавед без работы. Ён таксама павінен працаваць, тым больш, калі ён добры барабанчык.

На адлегласці 4-5 метраў ад малатарні складаецца стог саломы. І як ні дзіва, на падачы саломы на стог стаіць... 5 чалавек. Проста аднін у другога блытаюцца пад нагамі, перашкаджаюць. Тут таксама можна скараціць два чалавекі. І, нарэшце, на стаку сядзіць 4-5 чал. Дарэмная трата людзей, на 1-2 чал. як мінімум, можна скараціць. Усяго з малатарні з вялікім поспехам можна яшчэ не менш 7-9 чал.

Так разбазарвае рабочую сілу брыгадзір Цыганкоў.

Начальнік палітаддзела Лёзненскай МТС тав. **ДАНЦЫГЕР,** які наведаў калгас і азнаёміўся з малацьбой, рэзка асудзіў такую расстаноўку сіл. Тут-жа на таку ён выявіў і сапраўдныя прычыны такой ненармальнай загрузкі таку людзьмі. Справа ў тым, што ніхто, нават брыгадзір Цыганкоў, не ведае норм выпрацоўкі. Колькі-б людзей на таку не было, кожны спадзяецца атрымаць працадзень, як-бы ён ні працаваў. Не арганізавана барацьба за поўнацэнны калгасны працадзень. Працадні ўзважваюцца ў канцылярыі фахўшкавод Купчанка, а на таку аб гэтым ніхто не думае. Адсюль і ўсе вынікі.

Яшчэ аб якасці малацьбы. Малацьба проста злачынная. Процантаў 20-30 зерня застаецца ў саломе. Началіт таў. Данцыгер, які добра ведае машыну, заняўся высвятленнем прычыны дрэннай, нячыстай малацьбы. У калгасе ўвесь час мінаваліі машыну. На справе-ж аказалася, што вінаваты людзі, у першую чаргу брыгадзір і барабанщык. У торла малатарні ляхаюць авёс ахапкамі. Яна давіцца і прапускае неабмалочаныя не толькі каласы, а цэлыя пайвы.

Началіт тут-жа прапанаваў пусціць у барабан фоўнамерны пласт аўса. Пусцілі. Машына пашла з поўнай нагрузкай, і ў саломе зерне ўжо трэба было шукаць. Заўважыў началіт і невялікае «жульніцтва» практарыста: матор пускаўся не на належную колькасць абаротаў. Пры дапамозе началіта ддзела былі выяўлены сапраўдныя прычыны дрэннай малацьбы. Інспекцыя па якасці, якая зараз арганізавана ў калгасе, ацэніць работу брыгады № 2 на малацьбе, і вызначыць аплату ў адпаведнасці з заслугамі.

Пара заўважаў аб іншых «дробязях». Ідзе дождж. Ад таго, як будуць складзены і завершаны стагі, залежыць захаванне саломы. Стагі-ж складаюцца ня дбайна, добра не завяршаюцца, вада зацякае ў сярэдзіну, салома псуецца.

Аб мякіне. Аўсяная мякіна — корм не горшы, чым добрае сена. Злачынна адносяцца да мякіны ў другой брыгадзе. Частка мякіны складзена ў брыгадзе № 2 пад страхой так, што ў яе зацякае вада, частка-ж ляжыць пад адкрытым небам, можне.

Усё гэта паказвае, што брыгада № 2 дапускае вялікія страты ўраджаю, і тым самым зніжае вагу працадня.

Першы дзень сацыялістычнага спаборніцтва забяспечыў перамогу за першай брыгадай на чале з брыгадзірам Мінчанка.

А. МІКУЦКІ.

Лёзна, 16-X

Калгас **«ТРУДАВІК».**

Аршанскі раён выканаў план абавязковых збожжапаставак

ОРША, 20. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

НА 19 КАСТРЫЧНІКА АРШАНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛАН АБАВЯЗКОВЫХ ЗБОЖЖАПАСТАВАК ПА ЎСІХ СЕКТАРАХ НА 100 ПРОЦ. ПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАН ТАКСАМА ПЛАН ЗВАРОТА НАСЕНПАЗЫКІ.

УСЯГО НА 19 КАСТРЫЧНІКА ЗАГАТОЎЛЕНА ЗБОЖЖА 5.839 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 98 ПРОЦ. АГУЛЬНАГА ПЛАНА. 2 ПРОЦ., ШТО ЗАСТАЛІСЯ, ІДУЦЬ ЗА ЛІК НЕДАВЫКАНАННЯ ПЛАНА НАТУРАПЛАТЫ МТС.

ПА-ЎДАРНАМУ ПРАХОДЗІЦЬ АДГРУЗКА ГАРОДНІНЫ ЛЕНІНГРАДУ. ПЛАН АДГРУЗКІ Ў 359 ТОН БЫЎ ВЫКАЧАН ДА 17 КАСТРЫЧНІКА. ДАДАТКОВАЕ ЗАДАННЕ Ў 200 ТОН ВЫКАНАНА НА 20 КАСТРЫЧНІКА НА 93,5 ПРОЦ. ЗАУТРА АДГРУЗКА ГАРОДНІНЫ БУДЗЕ ЗАКОНЧАНА.

ПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛАН ЗЯБЛІВА

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначыў вялізарную важнасць зяблева для будучай веснавой сяўбы, для будучага ўраджаю. Пленум абавязаў: «Усе РК, палітаддзелы і РВК аддаць выключную ўвагу гэтаму важнейшаму пытанню і безумоўна забяспечыць поўнае выкананне плана зяблева і гэтым забяспечыць умовы далейшага ўздыма ўраджайнасці і больш паспяховага выканання плана веснавой сяўбы 1934 г.».

Паводле пастановы пленума план зяблева павінен быў быць выкананы поўнасцю не пазней 10-га кастрычніка г. г. Перад намі зводка аб ходзе зяблева па БССР на 15-га кастрычніка. Гадавы план па рэспубліцы выканан усяго на 28,5 проц. Саўгасы рэалізавалі заданне на 45,1 проц., калгасы — на 25,6 проц., аднаасобны сектар — на 33,1 проц.

Гэтыя лічбы — рэзультат яўнай недацэнкі зяблева з боку многіх раённых арганізацый. На мясцах няма баявой аперацыйнай работы, штодзённага кіраўніцтва зяблевам. Гэта работа адклад ваецца на апошні план. Таму з пяцідзённай у пяцідзённую тэмпы зяблева не павялічваюцца. За трэцюю пяцідзённую кастрычніка прырост выканання гадавога плана складае ўсяго 4,9 проц.

Злачынна зрываюць зяблева АСВЕЙСКІ раён, які выканаў план толькі на 4 проц., БЕШАНКОВІЦКІ—на 4,3 проц., СІРОЦІНСКІ — 8,5 проц., ЧАШНІЦКІ — 6,7 проц., ГАРАДОЦКІ — 8,8 проц., УВАРАВІЦКІ — 7,7 проц., БРАГІНСКІ — 9,5 проц., СУРАЖСКІ — 9,9 проц., УШАЦКІ — 12,6 проц., МСЦІСЛАЎСКІ — 12,5 проц., ДУБРОВЕНСКІ — 11,5 проц., ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ — 10,2 проц.

Такога становішча надалей ні ў якім разе нельга цярпець. Неабходна заразжа максімальна ўзняць тэмпы работы па зяблеву, забяспечыць поўнае выкананне плана ў бліжэйшыя-ж дні. Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны памятаць, што паспяховае правядзенне зяблева з'яўляецца важнейшай умовай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы будучага года, што партыя будзе мераваць па выкананню плана зяблева аб рабоце той ці іншай партарганізацыі, таго ці іншага комуніста.

У дні кастрычніцкіх свят у Менску адбудзецца кастрычніцкі ўсебеларускі злёт перадавых калгаснікаў - ударнікаў. Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны разгарнуць шырокую работу ў калгасах і брыгадах, арганізаваць барацьбу за выкананне плана зяблева пад лозунгам заваявання права на ўдзел у гэтым злёце.

Кожнае праўленне калгаса, кожны калгаснік павінен ведаць, што ўдзел у злёце перадавых калгаснікаў-ударнікаў будзе прымаць толькі той калгас, які па-большэвіцку справіцца з выкананнем усіх гаспадарча-палітычных кампаній, у тым ліку і з выкананнем плана зяблева.

Дзе-ж клопаты аб ураджаі?

ГОРКІ. Зяблевае ворыва—гэта зарука высокага ўраджаю. Але зусім інакш лічыць, відавочна, кіраўніцтва Чэрнеўскага сельсовета. У мінулым годзе Чэрнеўскі сельсовет сарваў план зяблева. У выніку большую частку пахаці прышлося ўзорваць вясной. Гэта, зразумела, адбілася на тэмпах і якасці сяўбы. Але кіраўнікі Чэрнеўскага сельсовета нічому не навучыліся.

Зараз зноў паўтарасцца леташняя практыка чарговасці кампаній. Старшыня сельсовета **Старасцін** лічыць, што раней трэба скончыць уборку і адгрузку бульбы, а тады можна ў за зяблева ўзяцца. Тэорыя і практыка Старасціна прывяла да таго, што план зяблева на 15 кастрычніка выкананы па сельсавету на 5,1 проц. З 660 га ўзарана толькі 34. Фактычна зазяблёў адзін калгас «**Ударнік**». Астатнія 9 калгасаў зяблева не пачыналі.

Райземаддзел і МТС не даюць ніякага адпору гэтай апартуністычнай практыцы чарговасці. Участковы агранам **Шазека** па 1-2 месяцы не бывае ў калгасах, а калі і з'явіцца, дык яраляціць мэтэорам. Так, у Горках «змагаюцца» за ўраджай будучага года.

Н. Г.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК і „ЗВЯЗДЫ"

Адзначым падрыхтоўку да Кастрычніцкіх свят завяршэннем адгрузкі бульбы Ленінграду ў бліжэйшыя пяць дзён

НЕ ПАЗНЕЙ 25-га КАСТРЫЧНІКА

Тэмпы адгрузкі бульбы ў гэтым годзе ніяк нельга параўнаць з леташнімі. Калі на 20 кастрычніка 1932 г. было адпраўлена Ленінграду 70.000 тон, або 36,6 проц. задання, дык на 20 кастрычніка 1933 г. адпраўлена звыш 227 тысяч тон, або 84,1 проц. плана.

Пры гэтым трэба памятаць, што **план гэтага года амаль на 50 проц. большы за леташні.**

Прычыны поспеха—ў значным арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, у паляпшэнні партыйна-масавай работы на вёсцы, і ў больш выразнай рабоце чыгуначных і загатоўчых арганізацый. Вялікую ролю адыграў таксама цвёрды і непахісны закон аб пастаўках бульбы.

Чыгунка за апошнія дні даказала поўную магчымасць забяспечыць высокія тэмпы адгрузкі, без перабояў падаваць паражняк—штодзённа грузілася ад 8 да 11 тыс. тон.

Аднак, ні ў якім разе нельга абысці міма буйнейшых прабелаў, дапушчаных у рабоце.

Усебеларускі рэйд ЦКК і «Звязды» выявіў рад вялікіх хібаў, якія тармозяць адгрузку.

Цэнтральныя загатоўчыя арганізацыі—**Белкаапгародніна і Белплодагародніна** з самага пачатку не забяспечылі канкрэтнага, аперацыйнага кіраўніцтва нізоўкай. Ва многіх раёнах падрыхтоўка да прыёмкі бульбы саўгаша—не хапае кадраў прыёмшчыкаў і вагаўшчыкоў, пункты не забяспечаны тарай, вагамі, ліхтарамі, саломай, брэзентам і інш.

На пасобных пунктах арудуюць варожыя людзі, якія злачынна зрываюць адгрузку, ашукваюць, абманваюць здатчыкаў, патураюць рвацкім антыдзяржаўным тэндэнцыям у здачы прадукцыі.

У «Звязде» ўжо прыводзілася шмат фактаў аб гэтым.

Тое, што Белплодагародніна дагэтуль рэзка адстае ад другой загатоўчай арганізацыі—Белкаагароднины—яна выканала план у размеры 78,8 проц. супроць 87,8 проц.—сведчыць, што БПГ яшчэ не дабілася пералома, яшчэ не перамагла канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва.

За апошні час чыгунка ўзмацніла гадачу вагонаў. Гэтыя абставіны ваханілі знижацку многія загатоўчыя арганізацыі: апошнія дэмабілізаваліся, карыстаючыся шырмай «чыгунка не падае вагонаў», яны фактычна спынілі дастаўку бульбы на пункты. Нарастае пагроза разрыва наміж пастаўкамі і адгрузкай.

У Чавусах чыгунка падала нядаўна 35 вагонаў, адгружана толькі 25, 10 пашлі паражняком. Віцебаты ў гэтым загадчык канторы Белплодагароднины **Бабенка,** які не пакланяціўся аб рабочай сіле. У Бабруйску былі выпадкі прастоя вагонаў па 8 і больш гадзін з-за недахвата грузчыкаў.

Нельга сказаць, што чыгунка працуе зусім здавальняюча. Ці мала ёсць выпадкаў скапчення і псавання бульбы на станцыйных пунктах і перавалачных прыстанях з-за непадачы паражняка, або падачы зусім нягодных вагонаў. Чыгунка не скарыстоўвае вопыта маршрутнага поезда імя «Звязды», яна не дабілася скарачэння шляха маршрутаў да Ленінграда інертнасць і коснасць чыгуначнай адміністрацыі трэба ва што-б там ні стала перамагчы.

Да тэрміна, вызначанага партыяй і ўрядам, засталося 5 дзён. За гэты час трэба вывезці каля 43 тысяч тон.

Пры ўмове сапраўды баявой работы чыгункі і загатоўчыкаў, мы поўнасцю справімся з ускладненай па нас адказнай задачай з гонарам выканаем свае абавязкі перад ленінградскімі рабочымі.

Кантрольны пост сігналізуе

БАБРУЙСК.

На Качэрыцкім прыёмачным пункце значная частка бульбы ляжыць на ўзвары пад адкрытым небам і пачынае псавацца. Грузяць бульбу ў цемпаце, бо на пункце ёсць толькі 7 ліхтароў, з якіх спраўных толькі 2 і тыя капцылярскія работнікі пункта забіраюць дамоў.

Ахова бульбы пастаўлена вельмі дрэнна—ёсць толькі адзін вартаўнік і той заўсёды дрэмле на пасту.

Каля складаў—непраланая тразь — бульбу ў ёй топчуць нагамі.

Было куплена вядро для вады, але прыёмшчык **Салановіч** забраў яго дамоў, і грузчыкі ходзяць за кілометр да рэчкі.

Прыёмшчык **Літвінка** займаецца ўчным шкодніцтвам. У часе яго дзяжурства пакралі брэзентавую палатку; ён выцягнуў фіцілі з ліхтароў і пакінуў склад без святла. Ноччу ў часе дзяжурства ён збірае кампанію грузчыкаў і гуляе з імі ў карты, а здатчыкам прыходзіцца чакаць па гадзіне і больш, пакуль гульня скончыцца.

На фаешную пляцоўку прыбывае з Баровіцкага пункта на машынах мокрая, дробная, змешаная з зямлёй бульба. Яе возяць навалам без тары. У райзагу ніхто не ведае, дзе тара знаходзіцца.

Нядаўна з Менска прыслалі для Бабруйскага райзага тару для бульбы. Аднак, яна зусім непрыгодная—з 2.000 рагож 600 парваных, гнілых.

Як паведамлялася, дырэктар райзага тав. **ПЛОТКІН** ашуквае грузчыкаў. Калі трэба грузіць, ён абяцае плаціць па 2 руб. за тону, а пасля пагрузкі плаціць значна менш—з-за гэтага кожны дзень сварэчкі і скандалы. Такія адносіны да работы недапушчальныя: трэба ўстанавіць дакладныя расцэнкі за работу па пагрузцы.

Пост РКК і «лёгкай кавалерыі» —ДЗЯДУЛЯ, ШУБА, ПАРАХНЕВІЧ І ЦЫРКІН.

Тэмпы адгрузкі бульбы

20/X 1933 г.

План	Адгружана	Процант выканання
270.270 т.	227.298 т.	84,1

20/X 1932 г.

План	Адгружана	Процант выканання
191.000 т.	70.000 т.	36,6

На копыскім пункце раскрадваюць бульбу

КОПЫСЬ.

Копыскі прыёмачны пункт Шклоўскага райзага з пачатку кампаніі за гатовіў для адгрузкі Ленінграду 1479 тон бульбы, з якіх адгружана каля 1.200, а 279 тон яшчэ ляжыць на пункце.

За гэта поўную адказнасць нясуць як загатоўшчыкі, так і чыгунка. Ёсць шмат выпадкаў, калі не хапае рабочых і цягавай сілы, з-за чаго прастойваюць вагоны.

17 кастрычніка чыгунка падала 8 вагонаў, а загружана толькі 5, бо не хапала рабочай сілы, каб падвесці бульбу да вагонаў.

Нямала ёсць выпадкаў, калі чыгунка зрывала падачу вагонаў. Яна часта падавала вагоны брудныя, непрыгодныя для пагрузкі. 16 кастрычніка чыгунка падала 12 вагонаў, з якіх у адзін зусім нельга было грузіць бульбу, бо ён быў увесь у дзёгці.

Раней прынятая ў здатчыкаў бульба ссыпалася ў груды каля пунктаў. Зараз яе трэба падвезці да вагонаў, але няма ў чым. На пункце зусім не падрыхтавана тара. У выніку—у першую чаргу пагружаюць у вагоны тую прадукцыю, якую тут-жа падвозяць здатчыкі, але не тую, якая доўгі час ляжыць пад адкрытым небам. Рай заг не прыняў ніякіх мер да забеспячэння копыскага пункта мяхамі.

Асабліва недапушчальнае становішча з аховай бульбы. Вартаўнік **Логінаў** зусім не сочыць за аховай, і таму частыя выпадкі пакражы бульбы.

Расцяжванне бульбы кандуктарамі і правадніка мі чыгункі стала сістэмай. Для загадчыка пункта Рыбакова і вартаўніка Лапінава—гэта звычайная рэч.

Брыгада РКК-РСІ і друку нядаўна, шукаючы вартаўніка, доўгі час хадзіла каля груд бульбы, капалася ў іх, і ніхто на гэта не звярнуў увагі.

Брыгада РКК і друку—КАЛАСОЎСКІ І МАКЕЕЎ.

Ніякай самасупакоенасці

Павышаныя тэмпы пагрузкі ў апошнія дні выклікалі зайчаснае школнае супакаенне ў радзе месц.

Гэтыя дэмабілізацыйныя настроі пагражаюць зрывам рэальных тэрмінаў адгрузкі бульбы Ленінграду.

Дзень 19 кастрычніка паказаў вельмі дрэнную ўвязку работы паміж раёнамі чыгункі і загатоўшчыкамі. Пагрузка ішла хаатычна. Прастаялі 85 вагонаў, якія не былі нагружаны.

Аршанскі раён чыгункі падаў нягодных 13 вагонаў. На станцыях Смалявічы, Жодзіна, Лепель, Віцебск прастаялі 54 вагоны з-за непадвозу бульбы.

У мэтах спынення гэтых агідпасцяй, упаўнаважаны ЦК і СНК тав. РАСКІН паслаў тэлеграму Аршанскаму, Віцебскаму, Жлобінскаму, Гомельскаму і Ўнецкаму чыгуначным вузлам і ўпаўнаважаным ЦК і СНК, у якой патрабуе па-баявому пераключыцца на выкананне задання па колькасных і якасных паказальніках.

Тав. Раскін паставіў перад СНК і ЦК пытанне аб лакаранні вінаватых у злачынных, шкодніцкіх адносінах да транспарта.

168 гадзін прастоя

ВІЦЕБСК.

Водны транспарт рэйса ў верасні не выканаў плана перавозак—перавезена 3 325 тон бульбы, замест 8.500. За 15 дзён кастрычніка перавезена 4.722 тоны, замест 6.575. Яшчэ не вывезена з суражскай прыстані 300 тон бульбы, прызначанай для Ленінграда.

Белплодагароднина дрэнна арганізавала пагрузку і выгрузку—адсюль вялікая колькасць прастояў. На віцебскай прыстані 5 лайб з бульбай прастаялі па 168 гадзін. 16 кастрычніка прыбылі лайбы з бульбай у адрас Белплодагароднины, яны яшчэ дагэтуль не выгружаны.

Кругласутачная пагрузка і выгрузка не наладжана. Зусім дрэнна пастаўлена ахова бульбы і збожжа—у выніку ёсць выпадкі пакражы, прычым вінаватыя да адказнасці не прыцягнуты. (Белта).

ПОУНАСЦЮ АЖЫЦЦЯВІЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК УсеКП(б) аб ПРЫСЯДЗІБНЫХ УЧАСТКАХ

ЗЛАМАЦЬ МАЛЕЙШЫЯ СПРОБЫ ПАРУШЫЦЬ УСТОЙЛІВАЕ ЗЯМЛЯКАРЫСТАННЕ У КАЛГАСАХ. СЯДЗІБНЫ УЧАСТАК НЕ ПАВІНЕН ПЕРАВЫШАЦЬ 0,5 ГЕКТАРА

УШАЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАТУРАЕ КУЛАЦКІМ АНТЫКАЛГАСНЫМ ТЭНДЭНЦЫЯМ

Палітычныя сляпцы

Факты, выкрытыя ў артыкуле ЦО **«ПРАВДА»** ад 9-га верасня «Политическая слепота» па Камарынскім і Дзяржынскім раёнах, маюць месца і ў **УШАЦКІМ** раёне.

Празмерна вялікія вырасныя за лік калгасных зямель, прысядзібныя ўчасткі, якія становяцца па сутнасці не падсобнымі, а асноўнымі гаспадаркамі калгаснікаў — даволі паширанае з'явішча ў раёне.

І гэта з'яўляецца адной з асноўных прычын таго, што раён апынуўся ў глыбокім прарыве амаль па ўсіх асенніх с.-г. работах. План сяўбы азімых выкананы на 9 проц., а задание па зяблеву — выкавана толькі на 8 проц. Калі 80 калгасаў яшчэ і не пачыналі зяблева. План збожжаставак выкананы усяго на 46 проц., натураплаты на 18 проц., за што **РАЁН ЗАНЕСЕН НА ЧОРНУЮ ДОШКУ.**

Не лепш справа з апрацоўкай і здачай ільну. План загатовак ільнавалакна выкананы толькі на 36 проц., ільнасалакна на 4 проц.

Калі 100 калгасаў дагэтуль не прыступілі яшчэ да перапрацоўкі бульбы.

У чым прычыны гэтых ганебных паказальнікаў?

— Слабая працдысцыпліна ў калгасах, запятасць рабочай і цягавай сілы калгасаў, галоўным чынам, на прысядзібных участках калгаснікаў; зусім пераструйная барацьба з гэтымі кулацкімі малеўрамі, накіраванымі на развал калгаснай вытворчасці; слабая барацьба з кулацкім саботажам паставак с.-г. прадукцыі.

ЯК РАЗБАЗАРВАЕЦЦА КАЛГАСНАЯ ЗЯМЛЯ

Звернемся да фактаў:

У калгасе **«ЧЫРВОНЫ СОРМАВЕЦ»** старшыня калгаса **СОБАЛЬ** засеяў свой уласны агарод, апроч гэтага на самым лепшым участку калгаснай зямлі адвёў і засеяў сабе адзін гектар. Яго прыкладу паследавалі і іншыя калгаснікі, захапіўшы па 3 га самай лепшай калгаснай зямлі пад уласныя пасевы. У калгасе больш працуюць на ўласных участках, а на калгасных палях работу зрываюць.

Або вось латыскі калгас **«ЦЭЛТНЕ»**, Вандаваўскага сельсавета. Гэты калгас пасеяў толькі 74 проц. жыта, бульбу выкапаў 24 проц., заазяліў толькі 8 га, сіласавання і не пачынаў, пастаўкі абожжа выканаў на 16,8 проц. і г. д. Ганебныя прарывы ў калгасе стварыліся з прычыны зусім слабага выхада на работу калгаснікаў.

Ды навошта выходзіць на работу на калгасае поле, калі амаль кожны калгаснік мае прысядзібны ўчастак ад 1 да 2 га. Калгаснікі працуюць на сваіх участках, а на калгаснае поле выходзяць толькі «у вольны час». У выніку гэтай кулацкай палітыкі ў калгасе на працадзень прыпадае ўсяго... каля 100 грам збожжа.

Трэба сказаць, што да гэтага калгаса высной і ў часе ўборкі была прыманована член прэзідыума РКК, старшыня бюро сакрэт РСІ таў. **ЛЕЙМАН**, што ў калгас не раз прыязджаў старшыня РКК РСІ тав. **БЕРЗІН.** Аднак яны нічога «не заўважылі». прайшлі міма кулацкай работы ў калгасе.

У калгасе **«ТРАКТАР»**, Чарапоўскага сельсавета, які адкрыта сабатуе абавязковыя паставкі, прысядзібныя ўчасткі раду калгаснікаў складаюць звыш 1,5 га. Але мала гэтага, кулацкія тэндэнцыі ўсё больш узрастаюць. Асобныя калгаснікі і зараз захапляюць калгасную зямлю і сеюць для сябе жыта.

Праўленне калгаса ведае аб гэтым, але маўчыць. Ведае аб гэтым і старшыня сельсавета **СЯНКЕВІЧ**, кандыдат партыі, але мер ніякіх не прымае. Нарашце, аб гэтых фактах пісала месяц назад рабочая газета, але не сігналы за сталіся пустым гукам. Ні РК КП(б)Б, ні РВК, ні райса, ні пракурор на іх не рэагавалі. Як відаць, яны лічылі гэтыя факты «дробязю».

У **ГАРБАЦІЦКІМ** сельсавеце адна-асобнікі вёскі **ПАВУЛЛЕ** вясной г. г. захапілі ўчастак зямлі калгаса **«ПРОЛЕТАРЫЙ»**. Праўленне калгаса склала аб гэтым акт і перадала яго ў сельсавет для прыцягнення вінаватых да адказнасці, але старшыня сельсавета **Шапыга** «згубіў» гэты акт і захопнікі калгаснай зямлі засталіся непакаранымі. Характэрна, што калгасу даведзена захоп на збожжаластаўках і на гэты захопцены ўчастак, а кулакі — захопнікі «ўмылі рукі». Аб усім гэтым ведае упаўнаважаны камітэта загатовак па Ушацкаму району тав. **Волкаў**, але мер ніякіх не прымае.

У калгасе **«4-ТЫ ЗАВЯРШАЮЧЫ»**, Жарнскага сельсавета, самі члены праўлення ўвесь час працавалі амаль выключна на сваіх уласных гаспадарках, а на калгасных палях выходзілі вельмі рэдка.

Дарэчы, у гэты калгас былі прыцягнуты з кулакі, якія мелі цвёрдыя заданні па сяўбе яшчэ вясной гэтага года. Ігры ўступленні ў калгас кулакі не абагулілі насенфонда і ў выніку калгас, з-за недахвата насення, недасеяў 2 га жыта. Рэзультатам кулацкай дзейнасці з'явілася тое, што на калгасным полі пасля капання 30 проц. бульбы засталося ў зямлі, пераворванне ў другі раз не праводзілася. Збожжаластаўкі правальваюцца (замест 2-х тон дзяржаве здана толькі 223 кгр.). Не дзіва, што ў гэтым калгасе вага працадня зусім мізерная і складае ўсяго 200 грам збожжавых. Трэба дадаць, што гэтыя кулацкія праделкі рабіліся на вачах члена бюро РК КП(б)Б, старшыні райпрафсавета **КАВАЛЕЎСКАГА.**

Аналагічныя факты маюць месца і ў радзе іншых калгасаў раёна (**«НОВЫ ШЛЯХ»**, **«ЧЫРВОНАЕ СЯЛО»**, **«БАРЫКАДА»** і інш.). Кулацкія манеўры не сустракаюць бальшавіцкага адпора з боку мясцовых парт'ячэек і сельсоветаў, а таксама з боку раённых партыйных і совецкіх арганізацый. Сакратар РК тав. **ТАРАСЕВІЧ**, старшыня РВК тав. **ЛЯСОВІЧ**, старшыня РКК **БЕРЗІН**, пракурор т. **СМІРНОЎ** добра ведаюць аб усіх гэтых фактах, але яны ніякіх мер не прымаюць, не хочуць заўважыць гэтыя манёўры кулака.

АПЯКУНЫ КУЛАЦКАГА АХВОСЦЯ

Толькі пасля сігналаў «Праўды» і пастановы ЦК КП(б)Б ад 11 кастрычніка старшыня РВК тав. **Лясовіч** вынёс у калгас **«ПРЫМЕЖНЫ КАЛГАСНІК»** агідныя факты. Калгаснікі на калгасных конях ездуць капаць уласную бульбу, паселную не на сваіх сядзібах, а на калгаснай зямлі, якую праўленне дала ім у свой час па прынцыпе «0,10 га на душу». Аднак, т. Лясовіч не прыняў ніякіх канкрэтных мер супроць гэтага. У калгасе дагэтуль не ўбрана яшчэ 15 га бульбы, не скончана сяўба, сабатуюцца пастаўкі. Тав. Лясовіч замест рашучага выкрыцця кулацкай палітыкі праўлення калгаса і прыцягнення вінаватых да адказнасці абмежаваўся толькі пустой балбатнёй на бюро РК, дзе таксама на гэтыя факты не рэагавалі.

Нікольні ў кіраўніцтве раённых арганізацый страчана класавая пільнасць, сведчыць тое, што выключаныя з калгасаў кулакі знаходзяць апору ў раённым цэнтры і адпаўзаюцца воляю раённых кіраўнікоў, як члены калгасаў.

Вось для прыклада калгас «Бнабожнік». Праўленне вычысціла з калгаса кулакоў **СТРЫЖОНКАЎ і ШАМШУРАЎ**, якія раней мелі да 60 га зямлі, па 10-12 кароў, арэндавалі цагельні, эксплуатавалі батракоў. Рэйса ўсё-ж знайшоў магчымым адпавіць гэтых кулакоў у правах калгаснікаў. Такіх выпадкаў у раёне шмат. Калгас «Звязда» кулакі зусім развалілі, райгазета выкрыла тут антысавецкую дзейнасць кулацкіх элементаў, але райса, пракурор і РСІ дагэтуль не прынялі ніякіх мер, не кіравацца на настойлівыя патрабаванні газеты.

Ёсць у калгасе **«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»**, «калгаснік» **РУСЕЦКІ**, які да ўступлення ў калгас меў 60 га зямлі, арэндаваў фольварак, эксплуатаваў наёмную рабочую сілу. Але Русецкі з'яўляецца братам адказнага сакратара райвыканкома і таму яго не чапаюць. Старшыня РВК Лясовіч ахоўвае спакой сакратара РВК і яго брата — буйнага кулака. Нават пасля пастановы бюро РК КП(б)Б аб звяцці Русецкага з пасады сакратара РВК і назначэнні па гэтым рабоўнага адпыльнага комуніста тав. Пятухова, тав. Лясовіч упіраецца і не выконвае гэтай пастановы. А сакратар РК тав. Тарасевіч не лічыць патрэбным прапарыць выкананне ім-жа вынесеных пастаноў. У рэзультаце Русецкі працуе і дагэтуль.

Чужымі элементамі засмечаны і некаторыя раённыя арганізацыі. Узяць для прыкладу райжывёлкантору. Там арудуюць **ГІНДЗІН**, сын буйнага спекулянта, выключаны пры чысцы з радоў партыі, **ІЛЬЮШЭВІЧ**, сын кулака, таксама выключаны з партыі, як класава-варожы элемент, **РАЧОНАК**, беспрабудны п'яніца, бюракрат і чыноўнік. Гэтыя класава-варожыя элементы ўзялі цалкам над сваёй уладай загатовка райжывёлканторы комуніста **ТАЛІКАЧОВА**, які спраўдзе сваю класавую пільнасць.

Нядзіўна, што жывёлагадоўля ў раёне — адсталы ўчастак. Адыход маладняка вельмі вялікі. З 923 цялят пала 118, з 1.584 свіней пала 315. (Гэта толькі паводле афіцыйных лічбаў райжывёлканторы!). МТФ укамплектаваны на 85 проц., СТКФ — на 70 проц. У радзе калгасаў фермы развальваюцца.

ЖЫВЕ ГОГАЛЕЎСКІ ПАШТМЕЙСТАР ШПЕКІН

Райгазета «Прымежны калгаснік» не раз выкрывала класава-варожую групу райжывёлканторы. Але сігналы газеты заставаліся непачутымі. Ні РК КП(б)Б, ні РВК, ні райКК на іх не рэагавалі.

Былі выпадкі, калі рэдактар газеты, як карэспандэнт «Белта», даваў тэлеграмы ў Менск аб агідных скрыўленнях закона ўрала па збожжаластаўках, аб падпалах сустрэчных планаў і інш. Але гэтыя тэлеграмы траплялі ў рукі загатоўшчыка райаддзела сувязі **АРЦЮХОЎСКАГА**, які, замест перадачы на прызначэнні, аддаваў іх сакратару райкома Тарасевічу. Апошні назаўтра на бюро РК называў рэдактара двурушнікам і інш. эпітэтамі.

РК ЛКСМБ невядома дзе загубіў без рэагавання 30 лістоў селькораў, пасланых райгазетай для расследавання. Райса сістаматычна не рэагуе на лісты селькораў, якія накіроўваюцца газетай. Усяго па раёне розныя арганізацыямі «згублена» 150 лістоў селькораў і калгаснікаў.

Што робіць прэзідыум райКК-РСІ. Замест таго, каб моцна ўдарыць па канкрэтных вінаватых райКК-РСІ займаецца выдзяўленнем агульных паставоў накшталт такіх, як «папярэдзіць кіраўнікоў» і г. д.

Так, у Ушачах зацісканць самакрытыку, пачынаючы з сакратара райкома і канчаючы загадчыкам аддзела сувязі Арцюхоўскім. Так пакрываюць класавых ворагаў, якія пралезлі ў калгасы і ў раённыя арганізацыі.

Рэдактар ушацкай раённай газеты

«ПРЫМЕЖНЫ КАЛГАСНІК»

БАЙКАЧОЎ.

АМАЛЬ ПА ГОГАЛЮ...

Кіраўнік ушацкай райканторы сувязі распячатвае канверты з лістамі, у якіх крытыкуецца раённае кіраўніцтва, і перадае гэтыя лісты на, так сказаць, узгадненне ў райком. Гогалеўскі паштмейстар Шпекін, аказваецца, жыве і на сённяшні дзень у Ушацкім р-не.

УЗАКОНІЛІ КУЛАЦКУЮ СЯДЗІБУ

ХУТАРСКІЯ „СЕВАЗВАРОТЫ" НА КРЫЧАЎШЧЫНЕ

Парушэнні закона аб калгасным зямлякарыстанні і празмерны рост прысядзібных участкаў калгаснікаў у Крычаўшчыне сустракаем на кожным кроку.

Сапраўды, як можна гаварыць аб устойлівым зямлякарыстанні, калі абрэзкі і прырэзкі калгасных зямель без санкцыі вышэйшай зямельнай камісіі робяцца ўсімі, хто толькі ўздумае. Так змяняліся межы калгасаў **«КРАСАТА»**, Касцюшкаўскага сельсавета, **«ЧЫРВОНЫ АРАТЫ»**, тарадскога совета, так было праведзена «зліццё» калгасаў «Кастрычнік» і «Беларуская Совета ў», так зусім нядаўна змянілі граніцы калгаса **«ЧЫРВОНЫ СОРМАВЕЦ».**

Закон аб устойлівым калгасным зямлякарыстанні — магутны вагар у барацьбе за павышэнне ўраджайнасці. Улоўнены ў непарушнасці сваіх граніц, калгас увосіць цвёрдыя севазвароты, лепш угнойвае і апрацоўвае глебу. Гэтага не зразумелі ў райземаддзеле (загатчык Лаўроноў) і ў іншых раённых арганізацыях.

У раёне ёсць 93 калгасы, складзена севазваротаў усяго 87, з якіх разглядкана 51, а рэшта загінула ў бюракратычных нетрах райземаддзела. Аднак, і гэтыя 51 севазварот фактычна парушаны.

Па практыцы райса выходзіць: севазварот — севазваротам, а пасеўны план сам па сабе. Вось чаму пасеўныя плацы даюцца калгасам без усякага ўліку севазваротаў, а проста, як у галаву ўзбрыдзе. Таму і залязаюць азімыя ў іншыя палі севазварота, або наадварот, азімы клін застаецца не поўнасцю засеяным. Характэрны выпадак быў у калгасе «Чырвоны барацьбіт», Баеўскага сельсавета, дзе на прызначэнні самога старшыні калгаса Дзямянава ўзятыя вясной участкі нарэшце так і засталіся незанятымі азімымі.

Яшчэ больш агіднае парушэнне дырэктыў партыі і ўрада мае месца ў адносінах прысядзібных участкаў калгаснікаў.

ПА-ПЕРШАЕ, РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ УЗАКОНІЛІ ЗБОЖЖАВЫ СЕВАЗВАРОТ НА СЯДЗІБАХ. У РЕСНАВУЮ ПАСЕЎНУЮ КАМПАНІЮ КАЛГАСНІКАМ ДАВОДЗІЛІСЯ ПЛАНЫ ПАСЕВА ЗБОЖЖАВЫХ НА СЯДЗІБАХ, ПАВОДЛЕ ЯКІХ ВЫПІСВАЛІСЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПА ЗБОЖЖАПАСТАЎКАХ.

Па-другое, ва многіх калгасах прысядзібныя ўчасткі перавышаюць норму і даходзяць да гектара і больш, што вельмі балюча адбіваецца на калгаснай гаспадарцы.

Вось некалькі прыкладаў:

Калгаснік **ВОЙЦЭХАЎ ІВАН** (калгас «Сталінскі заклік», Сакольніцкага сельсавета) мае сядзібу звыш 0,75 га. Сеяў ён на сядзібе пшаніцу, ячмень, проса, канопілі, бульбу й гарадзіну. Увесь гной, што накапляецца ў яго хлеве, укладае ён у сваю сядзібу, не даўшы калгасным палям ні адпаго воза. Сям'я яго больш працуе на сядзібе, чым на калгасным полі.

Калгаснік **КЛЯУСАЎ В.** таго-жа калгаса сеяў на сваёй сядзібе нават жыта.

Вылучаецца ў свой час (пасля пастановы ЦК УсеКП(б) камісія ад праўлення для праверкі сядзіб, але... «шумок» прапаў і камісія разышлася, нічога не зрабіўшы.

У калгасе «Новы шлях» сядзібы калгаснікаў ніколі не абмяраліся. У выніку, хаця і лічыцца, што ва ўсіх роўна па 50 сотак, але ў некаторых (Асмалоўскі, Назарыч) сядзібы нуда большыя. У гэтым калгасе выкрыт на дзіях такі факт, даволі распаўсюджаны па раёне: Сватковскія Парфён і Андрэй складаюць адну сям'ю, але атрымалі яны два «надзелы» па 0,5 га кожны.

У калгасе **«ЛЕНІНСКІ ПРЫЗЫЎ»**, Палапінскага сельсавета, таксама сядзібы не абмяраюцца. Старшыня калгаса **АТРАШКЕВІЧ** засакойвае сябе па тым, што «кожны павінен (?) мець па 50 сотак, а калі ў каго і ёсць больш, то гэта зусім (?) засеялі ўчасткі, кіпутыя аднаасобнікамі».

Адсутнасць барацьбы з празмерным ростам прысядзібных участкаў у радзе месц тлумачыцца тым, што самі кіраўнікі не ад таго, каб захапіць сабе сядзібы па-больш. Так зрабілі, напрыклад, старшыня калгаса **«ПРАЦА»**, Капанскага сельсавета, **БАНЬКОЎСКІ** і член праўлення **ВАЛЮЖАВІЧ.** Абуранасць захопам калгаснай зямлі калгаснікі ўзнялі аб гэтым пытанне на агульным сходзе і пастанавілі лішкі звыш 0,50 га адрэзаць і разам з пасевамі перадаць у калгас. Але пастанова схода не была выкавана.

Пераймаючыся з іншых калгасаў старшыні калгасаў, амаль як правіла, захоўваюць свае сядзібы па ранейшых месцах і бяруць сядзібу ў новым калгасе. Прыкладам гэтага можа служыць Сваткоўскі Алесь—старшыня калгаса **«Сталінскі заклік»**, жонка якога занятая работай на двух сядзібных участках не выпрацавала ў калгасе ні адпаго працадня.

Л. БУР.

ЧАМУ ЗМЯНШАЮЦЦА Ў ГОРКАХ КАЛГАСНЫЯ МАСІВЫ

ГОРКІ. (Ад нашага карэспандэнта).

Артыкул «Политическая слепота», змешчаны ў ЦО нашай партыі — газеце «Правда», цалкам і поўнасцю адносіцца і да Горацкага раёна.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб прысядзібных участках калгаснікаў у БССР, выкрываючэ кулацкай тэндэнцыі пашырэння прысядзібных участкаў у свой час не зрабіла ніякага ўплыва на кіраўнікоў арганізацый. Калгасная паступова змяншаўся за лік адчужэння прысядзібных участкаў калгаснікаў.

На прысядзібных участках, якія даходзілі ў асобных мясцах да 2 га (калгас імя Дзямяна Беднага), вялася горача работа, а на калгасных палях сяўба і ўборка зрываліся.

Сельсоветы, праўленні калгасаў па сутнасці патуралі кулацкім манеўрам. Больш таго, у асобных мясцах змянуліся ўстойлівыя «сакрэт» аб прысядзібных участках. **ПАРШЫНСКІ** сельсавет у часе разгортвання сяўбы заявіў, што ў яго но хапае зямлі для выканання пасоўнага плана, а пры праверцы аказалася, што сядзібы калгаснікаў даходзілі да 1,5 га. Асабліва гэта выявілася ў калгасе «Адказ пікоўнікам». Тут калгаснік Хмуровіч Сцяпан меў прысядзібны участак у 1,14 га, Хмуровіч Нікіфар — 1,15 га і г. д. **УСЯГО Ў ПАРШЫНСКІМ СЕЛЬСОВЕЦЕ ЗАХОПЛЕНА І ДАЛУЧАНА ДА ПРЫСЯДЗІБНЫХ УЧАСТКАЎ КАЛЯ 30 ГА КАЛГАСНАЙ ЗЯМЛІ.**

У Горацкім раёне амаль у кожным калгасе можна сустрэцца з такімі фактамі грубага парушэння правіл зямлякарыстання, прытуплення класавай пільнасці кіраўнікоў сельсветаў і парт'ячэек (Ждаўскі, Капылеўскі, Горскі і інш. сельсоветы).

Дайшло да таго, што ў асобных калгасах калгаснікі трымалі калгасных коняй на сваіх прысядзібных участках звыш 3-х дзён (калгаснік Клавадзеў з калгаса Кварчына) А ў гэты час у калгасе зрывалася сяўба і ўборка з-за адсутнасці цягавай сілы.

Бестурботнасць, страта класавай пільнасці ў раёне прывяла да вялікіх прарываў ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях. Новае кіраўніцтва раёна павінна мабілізаваць усю парт-арганізацыю, усіх працоўных на ліквідацыю гэтых прарываў. **ЯУХ. Г.**

СЕВАЗВАРОТЫ, ЗМАЙСТРАВАНЫЯ РУКОЙ ВОРАГА

У **АРШАНСКІМ СВІНАВОДТРЭСЦЕ** дапускаюцца грубейшыя скажэнні при ўвядзенні севазваротаў у свінагадоўчых саўгасах.

Пакажам гэта на прыкладзе саўгаса **«КОМСАМОЛЬСКАЯ ПРАЎДА»**. Саўгас мае вялікае стада свіней. На 1 студзеня 1933 г. у саўгасе налічвалася толькі адных свіноматак 212 штук. Стварэнне ўласнай моцнай кармовай базы — жыццёва неабходная задача для саўгаса. Тым больш, што кармоў у саўгасе са сваіх палёў не хапае, асабліва такіх, як бульба.

Які-ж выхад знаходзяць планавікі аршанскага свінаводтрэста?

А вельмі просты: яны ідуць на лінію найменшага супраціўлення — **ЗЛАЧЫННА ЗМЯНШАЮЦЬ КОЛЬКАСЦЬ ПАГАЛОЎЯ.** Свінаводтрэст запраектаваў у першым паўгоддзі 1933 г. пакінуць у саўгасе «Комсамольская праўда» замест 212 толькі 160 свіноматак з тым, каб да 1-га студзеня 1934 г. давесці гэту колькасць да 120-ці.

Па-другое, **СВІНАВОДТРЭСТ ЗМЯНШАЕ Ў СЕВАЗВАРОТАХ ЯКРАЗ ТЫЯ КУЛЬТУРЫ, ЯКІЯ НЕАБХОДНЫ ДЛЯ СТВАРЭННЯ КАРМОВАЙ БАЗЫ Ў САЎГАСЕ.**

У 1933 г. прапашныя культуры (бульба, буракі і г. д.) займалі ў севазвароце каля 25 проц. Што-ж прапануе свінаводтрэст для саўгаса «Комсамольская праўда» на 1934 год? Аказваецца, на будучы год паводле «севазварота» пад прапашныя — асноўны корм для свіней — адводзіцца толькі 19 проц.

Гэта грубейшае скажэнне выкрыў паліталіцэл калгаса, Мясоедаў, даўшы яму прапанаваці ўнесці адпаведныя змены. Але што зноў дапускае свінаводтрэст?

На 1934 год запраектавана засеяць толькі 70 гектараў бульбы замест засеяных у мінулым 84,2 га. Змяншаецца план і па сяўбе сілосных культур. Змяншаецца план і па сяўбе аўса і ячменю. Затое план на сяўбе кармовых траў павялічваецца на 22 гектары. І гэта ў той час, калі ў саўгасе ёсць вялікія лішкі на трубных кармах.

У чым усё-ж справа? Хто так пашкодзіў планаў гаспадарку?

Аказваецца, абавязкі агранома пры аршанскім свінаводтрэсце выконвае кулак **РУСЕЦКІ**, а ў саўгасе на пасадзе агранома сядзіць прыпічэнавец **ПУШКАРОЎ.**

Не дзіва, што ў саўгасе ўводзяцца правільны севазварот, які не дае саўгасу магчымасці развіваць і павялічваць поголоўе.

Апарат свінаводтрэста засмечан класава-варожым прыпічэнаўскім элементам.

Патрэбны энергічныя і неадкладныя меры.

В. Д.

Прарыў павінен быць ліквідаваны

10 кастрычніка праверком закончыў чыстку членаў і кандыдатаў партыйнай ячэйкі **віцебскай машына-трактарнай станцыі**, якая абслугоўвае 6 буйных вытворчых участкаў: Віцебскі, Салоцкі, В. Летчанскі, Ялатынскі, Барсуўлянскі і Бабініцкі.

Члены праверкома перад чысткай азнаёміліся са становішчам МТС, пабылі на асобных вытворчых участках. Толькі пасля азнаямлення са становішчам МТС праверком прыступіў да персанальнай праверкі членаў і кандыдатаў партыі. Сходы па чыстцы праводзіліся ў калгасе імя Чарвякова, Віцебскага сельсавета. Зрабіў гэта праверком з той мэтай, каб прыцягнуць найшырэйшыя масы калгаснікаў да ўдзела ў чыстцы ячэйкі МТС.

МТС сустрела чыстку з вялікімі прарывамі ў выкананні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. На 5 кастрычніка сярэдні процант абмалота збожжавых па МТС складаў 52,2 проц., лён абмалочан на 52 %, узпата пад зяблева конскай цягавай сілай 3,9 проц. трактарамі 38,1 проц. На Бабініцкаму ўчастку нават уборка збожжавых не скончана—сжата ўсяго 92 проц. 83 га яравых зусім не ўбрана. На Салоцкім участку збожжавыя абмалочаны на 47 проц. Збожжаластаўкі зрываюць участкі Віцебскі (59,8 проц. плана) і Бабініцкі (58,7 проц.).

Гэтыя ганебныя прарывы тлумачацца тым, што рад работнікаў апарата МТС знартуцілі, стычка адносіліся да выканання сваіх непасрэдных абавязкаў. Дырэктар МТС **Галавёнак** грубо ігнараваў настановы гаркома партыі, у якіх ускрывалася памылкі кіраўніцтва МТС і былі паказаны канкрэтныя шляхі іх выпраўлення.

Трактарны парк знаходзіцца ў безадказнейшым станоўішчы. Партыйная ячэйка і адміністрацыя МТС не скары сталі падрыхтоўкі да чысткі для таго, каб налаадзіць большавіцкі парадак на ўсіх участках дзейнасці машына-трактарнай станцыі, і таму да сённяшняга дня трактары знаходзяцца пад дажджом, інвентар МТС гніе, каштоўныя машыны валяюцца ў грязі.

У калгасе імя **Чарвякова** (старшыня калгаса **Остры**, загадчык вытворчага ўчастка **Радз**) на працягу ўсяго лета трактары знаходзіліся пад дажджом і ржавелі. Складная трактарная сявярка і бульбаканалка валяюцца ў грязі. Вядуць аб гэтым і Гала вёнак і сакратар парт'ячэйкі МТС тав. **Леўшын**, але нічога не зрабілі, каб прывесці і гэтыя машыны ў належны парадак, каб іх можна было карыстацца.

Запасныя часткі да трактараў раз базаваліся направа і налева. **Багрунас** (старшы механік МТС) раздаваў запчасткі, за што атрымліваў грошы. Трактары здаваліся ў рамонт прыватным асобам, і былі выпадкі, калі трактар, не пасля ўны выйсці з рамонта, зноў аддаваўся ў рамонт.

Сярод трактарыстаў адсутнічае працоўная дысцыпліна. 8-га кастрычніка на Барсуўлянскім вытворчым участку трактарыст **Марозаў** заехаў на заведзеным трактары. Такія злачынныя адносіны вядуць да паломак, аварый і інш. Усё гэта добра вядома кіраўніцкам МТС, але самёнасць, гніла-ліберальная, паабгрэйная адносіны, якія квітнеюць сярод работнікаў МТС, прыкрываюць гэтыя злачынныя дзеянні.

Партыйна-масавай работы ячэйка не праводзіла. Пастановы ЦК аб віцебскай партыйнай арганізацыі нават не прапрацаваны. Соцпаборніцтва і ўдарнікі сярод работнікаў МТС не разгорнута. Загадчыкі вытворчых участкаў не ведаюць, хто ў іх ударнік і хто лодыр. Так, напрыклад, у **Крукага**—(калгіпажаты Сямёнаўскага ўчастка) у часе яго персанальнай праверкі запыталі: «колькі ўдарнікаў на тваім участку» Ён адказаў: «Тры». Калі-ж праверком пацікавіўся паказальнікамі гэтых трох, аказалася, што ўсе яны ліквідарнікі, замест 3 га на водле плана выробляюць толькі 2 г.

Усё гэта прывяло да таго, што трактарны парк працуе зусім дрэнна. За ўвесь час стаўрыстана рабочых дзён на 71,2 проц., рабочых-жа гадзін толькі на 32,4 проц. Гэта значыць, што трастоі складалі 67,6 проц. План ворыва, барнавання і культывацыі выканан усяго толькі на 37 проц., план малацьбы — на 34,8 проц., сіласавання — на 43 проц., жніва і касьбы — на 13,8 проц.

Будаўніцтва новай МТМ павінна было закончыцца не пазней 1-га жніўня. Тэрмін даўно мінуў, але і зараз яшчэ не прыступілі да электраабсталявання, няма варштатаў. На электраабсталяванне і ўстаноўку варштатаў нават не складзены праекты. Злачынная бацькка з будаўніцтвам прывяла да таго, што замест 112.000 руб., асігнаваных на пабудову МТМ, ужо затрачана 250.000, а будоўля яшчэ далёка не скончана.

На будаўніцтва МТМ пралезлі класавыя ворагі, кулакі раскулачаныя— Лапухоў, Гулецкі, Міхайлаў. Яны раскрадзілі буданічны матэрыял, арудавалі «ціхай сапай», каб сарваць бу дзяўніцтва.

Гіровенка, будучы прарабам, праявіў палітычную блізарукасць. Ён не толькі не выкрываў класава-варожыя элементы, а сам абараняў кулакоў. Калі іх пачалі вычышчаць з будаўніцтва, ён запратэставаў. У мяне няма рабочых, забіраеце ollv» і т. д.

Па рэкамендацыі Гіровенка экспедытарам на будаўніцтва пралез **Качергін**, якога не раз судзілі за злачынныя дзеянні. Качергін праз некаторы час высоўваецца нам. начальніка буданіцтва і раскрадвае маемасць МТМ. Гіровенка, будучы сакратаром партыйнай ячэйкі, калчаткова развалі работу ячэйкі. На працягу шасці месяцаў пілат не склікаліся партыйныя сходы.

Загадчыкам кладовай і сталоўкі на будоўлі МТМ працуе **Уласенка** (член партыі). У часе чысткі выявілася, што на пачах Уласенка раскрадваліся буданічныя матэрыялы. Ён маўчаў, не жадаючы псаваць узаемадносіны са знаёмымі. Ён пакідаў працаўнічыкам лодырам, зрыўшчыкам працоўнай дысцыпліны, выдаючы ім абеды і інш.

Адзначаныя лагідасці маглі мець месца толькі таму, што самакрытыка ў МТС не разгорнута. Насценгазета выходзіла «на вялікіх святах».

Буйнейшым недахопам работы МТС з'яўляецца яшчэ і тое, што на падрыхтоўку кадраў па звараччэцца абсалютна ніякай увагі. Большасць трактарыстаў тэхнічна зусім неграмотныя, дэтальна не ведаюць трактара, адсюль частыя паломкі, аварыі і інш.

Ніякай партвучобы ячэйка МТС не праводзіла, палітгурткоў не арганізоўвала. Большасць комуністаў нават газет не чытаюць і таму ў часе персанальнай праверкі члены і кандыдаты партыі не маглі адказаць на самыя элементарныя палітычныя пытанні.

Праверком зачысціў ячэйку МТС ад знартуцістаў, перарадзіцаў, ад прымазаўшыхся і выпадкова трапіўшых у партыю. Разам з тым праверком вынесены рад канкрэтных прапаноў, якія павінны стаць праграмай дзейнасці ячэйкі на бліжэйшы час. У асобе палітадзіцыцаў, якія прыехалі ў Віцебскую МТС 12 кастрычніка, ячэйка мае моцных палітычных кіраўнікоў, якія дапамогуць у самы кароткі час зжыць прарывы.

К.

Усебеларускі конкурс ССТ і міжрэйбаз

АРШАНСКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ПА-БАЯВОМУ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ПЯРШЫНСТВА

Аршанскі райсаюз атрымаў пераходны чырвоны сцяг імя «Звязды» і Волкаанскаюза за пяршынства ва ўсе беларускім конкурсе. Спажывецкая сістэма Аршаншчыны да тэрміна — 20 верасня — выканала план таваразвароту і мабілізацыі сродкаў 3-га квартала.

Пасля атрымання сцяга аршанскія каапаратары не супакоіліся, не адпачылі ці лаўрах. Наадварот, яны зрабілі правільны вывад, што мала ўзяць сцяг, трэба яго ўтрымаць.

На другі-ж дзень пасля перадачы чырвонага сцяга праўленне райсаюза правяло шырокую нараду ўсіх старшынь, крамшікаў і рахункаводаў ССТ. Нарада ўключылася ў соцпабор ніцтва са спажывецкай кааперацыяй і ўзяла на сябе абавязацельства — **да кастрычніцкіх свят выканаць план 4-га квартала па таваразвароту і мабілізацыі сродкаў — на 50 проц., а да 20 снежня на 100 проц.**

Пешныя паўтары дакады 4-га квартала паказалі, што гэтыя самаабавязацельствы па-баявому правозяцца ў жыццё.

Да 15 кастрычніка задание па-за планавых закупак на 4-ты квартал выканала на 50 проц. Атрэўлена на вёску звыш 1.000 пар высокакласнага абутка, 7.000 пар галош, шмат гатовай вопраткі і інш.

Уліваючы пашыканы попыт калгаснай вёскі, райсаюз высунуў сустрэчны план па-за планавых закупак у 600 тыс руб.

Пераважная большасць сельспажыўтаварыстваў на основе ўнутры раённага соцпаборніцтва разгарнулі ўдарную работу. За мінулыя паўтары дакады Багушэўскае, Дуброўскае, Якаўлевіцкае, Шапкаўскае ССТ выканалі свой квартальны план таваразвароту на 20 і больш процантаў.

Старшыня Шабецкага ССТ **МАКАРЭНКА**, які пасля атрымання чырвонага сцяга пагоршыў работу, знят з працы, вакол гэтага мабілізавана прамадзская думка.

Сельспажыўтаварыствы Аршанчыны паладзілі дакладны ўлік патрабаванняў спажыўцоў. На сходах калгаснікаў ва ўсіх калгасах Дуброўскага сельсавета прыгутчалі крамлікі, якія знаёміліся з попытам калгасаў і калгаснікаў. У рэзультаце **Дуброўскае ССТ** атрымала ад кожнага калгаса заяўку на поўны асартымент і колькасць тавараў. Ад многіх калгаснікаў паступілі заяўкі на швейныя машыны, грамафоны, ватнія коўдры, джэмперы і інш. Асабліва вялікі попыт на тавары ў калгасе «Іскра», дзе вага працадня ўзрасла з 2 да 5 кілаграм збожжавых.

На аснове гэтых заявак пладуна закуплена і рэалізавана 100 грамафонаў.

Вялікую ролю адыгрывае планавасць работы ССТ. Возьмем **МАШКАЎСКАЕ** сельспажыўтаварыства. Старшыня гэтага ССТ тав **ЯРОШАЎ**, каб не траціць часу на працыцыйную «раскачку», вылічыў, колькі трэба краме прадаць у дзень тавараў, каб да кастрычніцкіх свят выканаць квартальны план на 70 проц. Гэтыя заданні ён давёў да кожнай крамы. У рэзультаце тыя крамы, якія дагэтуль прадавалі тавараў на 700-800 руб., зараз прадаюць на 1300-1400 р.

Шмат увагі адасцца паліпшэнню тавараў да спажыўца, лепшаму абслуго

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

Ганаровае месца ў кастрычніцкай дэманстрацыі павінна належаць перадавым прадпрыемствам, выканаўшым план па ўсіх паказальніках

ПЕРАКЛЮЧЫМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НА РЭЙКІ АЎЛАДАННЯ ТЭХНІКАЙ, НА БАРАЦЬБУ ЗА КУЛЬТУРНУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ

ПОУНАСЦЮ СКАРЫСТАЦЬ ЦЭХАВАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

Усім вядома, што поўнае скарыстанне цэхавага абсталявання неабходная ўмова для паспяховага выканання грамфінплана. Але гэтага яшчэ не разумеюць у кавальскім цэху завода **«Чырвоны металіст»** (Віцебск).

Загадчык цэха тав. **Лебедзеў** увесь час імкнецца даказаць, што з рамонтам і скарыстаннем абсталявання справа стаіць добра. На самой справе гэта не так. Зайдзіце ў кавальскі цэх і вы адразу ўбачыце, што словы тав. **Лебедзева** не адпавядаюць сапраўднасці. У калільным аддзяленні ўжо доўгі час (два тыдні) ляжыць разабраным фрыкцыйны прэс № 17. Некалькі разоў рамантавалі яго, затрацілі сроўкі, але рамантавалі зусім дрэнна. Напрацаваўшы некаторы час, прэс зноў перастаў працаваць. І так на працягу 4-5 месяцаў.

Загатчык цэха гэта абыватальску тлумачыць гэта тым, што прэс выраблен **нашым заводам**, таму да яго нельга прад'яўляць вялікіх патрабаванняў.

З вазі кавеньных молатаў у раменьне зайсёды ўсе 85-кілаграмны пневматны молат, не гледзячы на тое, што ён быў пашыты ў капітальным фасонце, зноў часта рамантуецца. Пневматны молат у 25 кг. пастаўлен на тэмп фундамент, што можна на ім працаваць не больш 2 дзён: дзень-два адпачываюць, а потым дні тры рамантуюць. І так увесь час.

Частыя нястоі молатаў бываюць таксама з-за нясвоўчасці печак. Брыгада кавеньку дрэнна адносіцца да сваёй работы, печы кладуцца дрэнна, у выніку чаго замест 5 дзён печка працуе ўсяго два дні.

У кавальскім цэху знаходзіцца шмат бясхазяйнага каштоўнага абсталявання. Як багатуюцца гэтыя машыны, за якія совецкая дзяржава плаціла золатам замежным капіталістам? Вось факты.

20 мая ў выніку нядбайных адносін рабочага **Гныванка** вывешен са строя магутны **125**-тонны гідраўлічны прэс. Для рамонта яго быў дан тэрмін у **20** дзён. Прайшло пяць месяцаў, а прэс усё яшчэ знаходзіцца ў пакаёвым вінце. Аказалася-б, што на фактыцна паломкі 125-кілаграмнага молата трэба было мабілізаваць увагу рабочых на ахову свайго абсталявання, але гэтага не было зроблена. Праз некалькі дзён рабочы **Гуціи** сваёй нядбайнасцю выкінуў са строя на некалькі дзён імкнутны 62-тонны прэс. Рабочы **Баранькоў** з-за нядбалага абыходжання псуе імкнутны бульдозер. Рабочы **Палудзеткін** — спружынны молат.

Паломкі ўвайшлі ў сістэму і іх лічаць нармальнымі з'явішчамі. Кожны дзень молаты падвінчваюць і рэгулююць, расклачваюцца за шабраяжаны капітальны рамонт.

Трэба пры гэтым сказаць, што рамонтныя рабочыя атрымліваюць зарплату не ад якасці зробленай работы. Старэйшы механік завода **Шкуберт**, выключаны з партыі як двурушнік і апартуніст, па-ніколіцку адносіцца да сваёй работы.

Зусім не правоцэліцца тэхнічная вучоба ў цэху. Замест 55 запісаўшыхся ў тэхнікум, наведваюць яе 3-4 чалавекі. Адміністрацыя завода не клапоціцца аб забеспячэнні наведваючых школу добрымі ўмовамі вучобы.

Ненармальным з'яўленнем таксама тое, што ў часе працы на малыя па некалькі разоў змяняецца работа.

Рабочы **Гурзвіч** працаваў 13-X на 112-тонным прэсе. За час сваёй работы ён штампаваў дэталь № 29, потым № 59, потым № 63. Калі прыйшоў пад увагу, што для кожнай работы трэба перастаўляць штамп, адрэгуляваць яго, што адымае шмат часу, то зразумела бывае, чаму не выконваецца норма. Можна было падрыхтаваць жалеза на ўсю змену на адну работу, але гэтага чамусці не было зроблена.

Праца на покіўках рабочага **Васілеўскага** 11 кастрычніка даказвае, што і тут не ўсё гладка. У гэты дзень ён змяняў работу 5 разоў. Брыгада рабочых **(Сокалаў, Булоў, Бляхман, Поусакоў)** 11 кастрычніка за час сваёй работы рабіла наступнае: рэзку палос для нажоў, рэзку палос для аглабеньнікаў, пашоску палос, устаноўку нажоў, устаноўку ўпораў, перапыўку рамяня.

У кавальскім цэху шмат абсталявання зусім не скарыстоўваецца. З 1930 года стаіць у цэху бульдозер выраба завода «Серп і молат». На яго ўстаноўку затрачана шмат часу і сродкаў, але яго не скарыстоўваюць у цэху і не перадаюць іншым прадпрыемствам. Стаіць без работы вялікі балтавы прэс (фрыкцыйны), а таксама падаючы молат. Трэба, нарэшце, прыняць меры для іх скарыстання або перадаць іншым прадпрыемствам.

Рамонтны цэх не выконвае сваячасова рамонта абсталявання. 100 і 85-кілаграмныя молаты замест планавых 8 дзён рамантуюцца 18 дзён. Тры месяцы рыхтуюцца падушкі для коўачнай машыны. Няма базавой білізны рабочых па сваячасовым і добраякасным рамонце.

Трэба зрабіць рашучы пералом у адносінах да абсталявання. Разбіць нянікавільную думку **Лебедзева**, што ў цэху з абсталяваннем «всё добра».

Артабалеўскі, Конюхаў.

БОЛЬШ НЕ БУДЗЕМ РАБІЦЬ БРАКУ

18 кастрычніка пры рэдакцыі газеты **«Звязда»** адбылася нарада рабочых швейнай прамысловасці па пытанні зніжчэння брака. На нараду прышлі лепшыя ўдарнікі менскіх фабрык, былыя бракаробы, прышлі і тыя, якія па сваёй нядбайнасці робяць брак і па сёмешні дзень.

Для рабочага фабрыкі «8-е сакавіка» **Клёнскага** было незразумелым, якім чынам ён трапіў на гэтае пасяджэнне.

— Навошта мяне выклікалі сюды, — пытае ён, — я-ж не актывіст, нават не лічуся ўдарнікам.

— А чаму ты не ўдарнік?

— Да мяне няправільна падышлі фабрычныя арганізацыі.

— І **Клёнскі** змераў прысутных вачыма і потым чырванеючы пачынае прызнавацца ў тым, што ён робіць брак. Сваё бракаробства ён апраўдвае прычынамі «аб'ектыўнага» парадку.

— Адпойчы я ўрышоў на фабрыку, — гаворыць ён далей, — і мне не хацелася распальваць свой цюг. Я ўзяў яго ў свайго таварыша. Ну і гэтым цюгом прапаліў паліто заказчыка. Першы раз за гэта мне патрэбна было даравацъ, а мне далі вымову ды пасадзілі мой партрэт у вітрыну бракаробаў. Ну і пазбавілі права быць ударнікам...

— І пасля гэтага ў цябе не было брака?

На гэта пытанне Клёнскі не адказвае. Што-ж, уласна кажучы гаварыць? Усёй фабрыцы вядома, што Клёнскі сістэматычна выпускае брак. Ён — вораг соцыялістычнай вытворчасці. Ён кагаршае дабрабыт рабочых і калгаснікаў сваёй дзейнасцю.

— Тое, што наша фабрыка выпускае многа брака, — гаворыць рабочы той-жа фабрыкі **Каплінскі**, — гэта-ж не сакрэт. Фабрыка мае сотні рублёў страт у выніку выпуска бракаванай прадукцыі. Але што робіць наша кіраўнікі, дырэктар **Шапіра**, сакратар партячэйкі **Шэйман?** У іх бывае так, што хто робіць многа брака, яго лічаць ударнікам. Вось, напрыклад, «комуніст» **Плоткін**, ад малога брака дайшоў да псавання каштоўнага матэрыяла заказчыка. Адпойчы ён спаліў паліто заказчыка. Гэтае паліто прыйшлося перарабіць, а за псаванне матэрыяла пашыць паліто з фабрычнага сукна. Такім чынам, заказчык мае два паліто, адно з іх давалося яму даромна. Між тым Плоткін за гэта не атрымаў ніякага спагнання. А вось я, толькі адзін раз не заглядзеў і падпаліў паліто. Мне, нічога не кажучы, фабрычныя арганізацыі ўсынялі як належыць. Знялі з мяне разрад, пазбавілі права быць ударнікам, пасадзілі ў вітрыну бракаробаў. І хаця я зараз брака не раблю, а ў вітрыне маю фатаграфію трымаюць на працягу двух месяцаў.

— Наш цэх выпускае сістэматычна бракаваную прадукцыю, — гаворыць рабочы **Адынец**, — за гэта свялі інструктара **Арончыка**. А мне сказалі, што я таксама кепска абкідаў пятлічы ў паліто. Знялі разрад, пасадзілі ў вітрыну. Пасля гэтага на працягу трох месяцаў я не зрабіў ніводнай адзінкі брака. А ў вітрыне бракаробаў сяджу і па сёмешні дзень.

— Загадчык кантрольнага аддзела **Красоўскі** таго, хто яму падабаецца, пакрывае, хоць ён і робіць брак, — гаворыць рабочы **Мінковіч**. — Возьмем, напрыклад, рабочага **Гурзвіча**. Ён з'яўляецца заядлым бракаробам, але-ж фабрычныя арганізацыі лічаць яго ўдарнікам. Наша фабрыка ганебна адстае ў выкананні вытворчай праграмы, дае многа брака.

Рабочыя-ўдарнікі расказалі аб тым, што на фабрыцы «8-е сакавіка» ніякай партыйна-масавай і выхаваўчай работы сярод рабочых не праводзіцца. Кіраўнікі думаюць зніжчыць брак толькі шляхам адміністрацыйнага націска. Ёсць на фабрыцы такія рабочыя і работніцы, якія ўгуграюцца выконваць план і нават перавыконваць яго па колькасці і зусім не звяртаюць увагі на якасць прадукцыі. Кантралёры вельмі кепска адносяцца да сваіх абавязкаў. Яны не вучаць рабочых і работніц працаваць так, каб не было брака.

Швейная фабрыка імя Крупскай у першым квартале выпусціла бракаванай прадукцыі на **1.025** руб., у другім — **1.396** руб., у трэцім — **2.213** рублёў.

Лічбы паказваюць абсалютную бяздзейнасць фабрычных арганізацый у справе мабілізацыі грамадскасці на барацьбу з бракам. Чым можна вытлумачыць такое становішча, што на фабрыцы з 28 комуністаў ні аднаго няма ўдарніка. Вось чаму брак з квартала ў квартал павялічваецца.

Бяздзейнасць фабрычных арганізацый можна пацвердзіць і тым, што работніцы, якія жывуць у фабрычным інтэрнаце, па некалькі месяцаў не ведаюць, хто кіруе фабрыкай. Работніца Міронава працуе на фабрыцы 9 месяцаў. На нарадзе ёй задалі пытанне:

— Вы ўдарніца?

— Не ведаю.

— План выконваеце?

— Выконваю. Брака ў мяне няма.

— Старшыня фабкома бывае ў інтэрнаце?

— Ні разу не бачыла. Чаго ён пойдзе да нас? У інтэрнаце цёмна, няма электрычнасці.

— А вы ведаеце, што ваша фабрыка не выконвае грамфінплан?

— Мне аб гэтым ніхто не сказаў.

Вось вам ясправы прыклад таго, што на фабрыцы ніякай работы не праводзіцца з тымі работніцамі, якія ўпершыню трапілі на прадпрыемства. Дырэктар **Шмуклер**, сакратар партячэйкі **Цыперовіч** апраўдваюць невыкананне плана адсутнасцю **200** работніц і нічога не робяць для таго каб зніжчыць цякучасць рабочай сілы.

Задача швейнай прамысловасці, як сказалі рабочыя на нарадзе, — да Кастрычніцкіх свят дабіцца карэннага пералома ў паляпшэнні якасці прадукцыі. Гэтага патрабуе краіна.

— Мы абяцаем рэдакцыі, што ў нас не будзе брака, падтрымалі іх бракаробы.

А. С.



У СТРОЙ ГІГАНТАЎ 2-ой ПЯЦІГОДКІ ЎСТУПАЕ КРЫЧАЎСКІ ЦЭМЕНТНЫ ЗАВОД.

Арганізуем „Асацыяцыю аўтараў тэхнічнай літаратуры"

(У парадку прапановы)

Перыяд асваення тэхнікі, калі партыя паставіла перад прамысловасцю задачу — даць прадукцыю высокай якасці, не зніжаючы колькасці, выдавіне тэхнічнай літаратуры набывае асаблівае значэнне. Выданне тэхнічнай літаратуры — адказны ўчастак культурнага развіцця шырокіх мас рабочых і калгаснікаў.

А між тым гэта галіна знаходзіцца ў неарганізаваным, беспаралельным становішчы. Работа інжынерна-тэхнічных таварыстваў (НІТО) ахоплівае ў большасці сваёй аўтарскую работу па выданні тэхнічнай літаратуры. Арганізацыі НІТО імкнуцца кожная ў сваёй галіне па-свойму, спецыфічна вырашыць пытанні выдання тэхлітэкі, лекцый, брашур, кніжак і г. д. Але работа гэтых арганізацый ідзе бяспаляна, часам без належнага грунта.

Тэхпропы наркаматаў, трэстаў, фабрык і заводаў таксама самі па сабе ставяць тэмы для выдавнічаў, вярбуюць «сваіх» аўтараў для напісання розных літаратуры. Вось, напрыклад, тэхнічнае выдавецтва Наркамлегпрама БССР, просты і непасрэдны абавязак якога — арганізаваць выданне масавай тэхлітаратуры, распрацоўвае тэматыку, не ўзгадняючы яе з адпаведнымі арганізацыямі. Напісанне розных тэм даручае часам спецыялістам нізкай кваліфікацыі.

Апрача гэтых «арганізаваных» аўтарскіх кропак мы маем цэлы ряд аўтараў-адзіночак, якія прыходзяць у выдавецтва іншы раз з ужо напісанымі работамі. Але нярэдкі і такія выпадкі, калі на думцы якога-небудзь работніка тэхвыдавецтва гэта кніга не падыходзіць і яе не друкуюць, бо яна, не ўвайшла ў план выдавецтва. Сярод такіх «непатрэбных» кніг часта трапляюцца вельмі каштоўныя работы.

Інстытуты Акадэміі Навук таксама зусім самастойна даюць прадукцыю і выдаюць. Тэматыка не заўсёды бывае актуальнай.

Чаму ўсё гэта так неарганізавана робіцца? Таму, што аўтар тэхнічнай літаратуры не мае свайго адзінага цэнтра. А патрэбуецца яго зусім відавочна. Вось на вечары ўрачыстай сустрэчы навуковых прадаўнікаў з Беларускім цэнтрам я прапанаваў стварыць асацыяцыю аўтараў тэхнічнай літаратуры. Удзельнікі пасяджэння гэту прапанову і пацвердзілі, што такі кіруючы цэнтр безумоўна [illegible] аб'яднаць, арганізаваць распыленае аўтарства тэхнічнай літаратуры зараз надзвычай патрэба.

Безумоўна, такі цэнтр у значнай ступені забяспечыць стварэнне добраякаснай літаратуры [illegible] аўтара, маладога рабочага, творца тэхнічнай думкі.

Мы лічым, што такі цэнтр найбольш магчымна арганізаваць у форме асацыяцыі тэхнічнай літаратуры БССР. Гэта асацыяцыя [illegible] арганізавана: як неаддзелная частка тэхнічнага выдавецтва, дзе пад непасрэдным кіраўніцтвам праверанных, вопытных работнікаў тэхвыдавецтва пазіна праводзіцца сістэматычная работа па стварэнні тэхнічнай літаратуры.

Асацыяцыя будзе займацца падборам тэм сапраўды патрэбнай тэхнічнай літаратуры па розных галінах народнай гаспадаркі па пытаннях аўладання тэхнікай, па выданні падручнікаў для тэхнічных навучальных устаноў, па апісанні беларускіх ізотавых і г. д. Гэта арганізацыя павінна аб'яднаць аўтараў, якія пісалі і могуць пісаць на пытаннях тэхнікі, і праводзіць з імі сістэматычную масава-арганізацыйную работу.

Такая арганізацыя, як асноўны кіруючы цэнтр, зможа атрымліваць ад розных арганізацый неабходныя заказы, тэматыку, увязваючы з патрэбамі народнай гаспадаркі, зможа даручаць напісанне работ поўным аўтарам высокай кваліфікацыі.

Непасрэдная функцыяй асацыяцыі будзе з'яўляцца напісанне рэцэнзій на выданыя кнігі, брашуры, прыцягненне шырокіх рабочых мас да гэтай справы.

Колькі такіх выпадкаў сустракаецца, калі часамі каштоўнейшыя работы па розных галінах тэхнікі марнуюцца ў партфелях цяперашняга Тэхвыдата? А гэта-ж, апрача таго, што затрымлівае выданне капітуючай прадукцыі, абмяжоўвае ўсякую творчую ініцыятыву ў рабочага, спецыяліста.

Вось характэрныя факты. Рабочы аўтар тав. **Гардон** напісаў вельмі цікавую кніжку **«Путеводитель по швейной фабрике «Октябрь»**. У кніжцы апісваецца работа апрэтажу, патрэбны на дыход да асобных працэсаў. Аўтар кнігі знаёміць новапрыходзячых на фабрыку рабочых з працэсамі швейнай вытворчасці. Кніга ўхвалена і прынята да выдання. Але вось ужо два гады, як рабочы аўтар тав. Гардон абівае парогі ў тэхвыдавецтва, падштурхоўваючы выцуск сваёй працы.

Другі факт. У момант арганізацыі спецыяльнага тэхнічнага выдавецтва пры ВДВ быў атрыман рукапіс па выданні кнігі, якая і зараз яшчэ не выдана.

У нас з тэхнічнага выдавецтва выходзяць часам кнігі вельмі дрэнна афармленыя. Там сядзяць на гэтай справе людзі, недаацэньваючыя эстэтычнага боку тэхнічнай літаратуры. А кніга, прыгожа афармленая, больш прыцягвае совецкага чытача, чым кніга ў прэтнай вокладзе, нярадка з карэктурнымі памылкамі і без сэнса расстаўленымі малюнкамі.

Калі ўлічыць, што ў адным толькі горн. Менску ёсць больш 250 аўтараў тэхнічнай літаратуры, якія пішуць артыкулы, лекцыі для радыё-перадач, брашуры, дык такі кіруючы цэнтр неабходны.

Выносячы гэту прапанову на грамадскае абмеркаванне, мы спадзяемся, што такая асацыяцыя будзе ў хуткім часе арганізавана.

Старшыня рэспубліканскага бюро НІТО керамікаў інжынер **КАЦНЕЛЬСОН.**

Тры месяцы без плана

Маслярскі камбінат за першае паўгоддзе выканаў сваё задание на **88,5** проц. і моў дэфіцыт на **31.000** руб.

Дырэктар камбіната Слабінскі працуе ў трэцім квартале працаваць без уплаты плана. З ім згадзіўся сакратар парткамітэта ячэйкі **Гінзбург**. І стварылася такое становішча, што не толькі рабочыя камбіната не ведаюць, як іх прадпрыемства працуе, але не ведаюць гэтага і самі кіраўнікі. Яны займаюцца чым хочаце, толькі не кіраўніцтвам сваімі прадпрыемствамі.

У рабоце рыхтуюцца да злёта ўдарнікаў тэхвучобы і якасці прадукцыі, а камбінат гэта не датычыць. Хоць з работай гэтага прадпрыемства кіраўнікі рабочых партыйных і прафсаюзных арганізацый добра знаёмы, але чамусці мер ніякіх не ўжываюць.

Гр. Кугель.

Зламаць сабатаж адгрузкі дроў пролетарскім цэнтрам

ЧЫГУНКА І ЛЕСБЕЛ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ ДА ВЫВАЗКІ ДРОЎ З ЛЕСПРАМГАСАЎ

Поўная бяздзейнасць

Маслярскі леспрамгас з месяца ў месяц, з квартала ў квартал не выконвае плана загатовак і вываз**кі** такіх вострадэфіцытных лесаматэрыялаў, як рудстойка, бандарныя клёпкі, дручкі, не гаворачы ўжо аб дровах, і інш.

На 10 кастрычніка квартальны план па лесазагатоўках выкананы па вывазцы строю на 9,4 проц. і па дровах—24 проц.

Прычыны прарываў крыюцца ў першую чаргу ў нікуды не вартай рабоце леспрамгаса. Аперат леспрамгаса замест канкрэтнай жывой работы займаецца перапісваннем і спісваннем розных паперак. Ні адзін з работнікаў леспрамгаса не бывае на ўчастках. Дырэктар т. Сіманоўкер толькі тое і робіць, што канстатуе факты зрыва планаў, але мер ніякіх да папярэджвання гэтых зрываў не прымае.

Не адстаюць ад леспрамгасаў у бяздзейнасці шмат якія сельсоветы. Разлічочыя 5 сельсоветаў В. Аўцюкоўскі, Клінскі, Ліпаўскі, М. Аўцюкоўскі, Цярбаўскі, якія павінны вывезці больш 50 проц. плана, найбольш адстаюць.

Узяць хаця-б Клінскі сельсавет. Ён павінен вывезці 10875 куб. м. лесаматэрыяла і загатовіць 600, выканаў-жа ўсяго толькі 8 проц. плана.

РК КП(б)Б абвясціў двухдэкаднік штурма лесазагатовак. Гэты дэкаднік, аднак, не атрымаў шырокага размаха, не даў належных вынікаў.

Бяздзейнасць, якая была ў раённых арганізацыях, сельсоветах да абвяшчэння двухдэкадніка, застаецца і па сёмешні дзень. Так за час з 3 па 10 кастрычніка Цярбаўскі і Клінскі сельсоветы не маюць ніякага прыросту, М. Аўцюкоўскі мае прырост 1,3 проц. і г. д.

Вельмі часта бяздзейнасць сельсаветаў арганізацый не без поспеху скарыстоўвае класавы вораг для зрыву лесазагатовак. Возьмем для прыкладу в. Ператок, Ліпаўскага сельсавета. Член сельсавета гэтай вёскі — Рубцоў бяздзейнічае, а кулакі — Алісейка Пархом і Пікун С. арганізуюць сабатаж супроць лесавывазкі. Старшыня Бярозаўскага сельсавета Сімановіч сваю бяздзейнасць прыкрывае «очковтирательством», а кулацтва пад самым носам старшыні Бярозаўка сабатуюць лесавывазкі і загатоўкі.

Зараз для лесавывазак наступілі гарачыя дні, бо ўборка і асенняя сяўба ў асноўным закончаны. Гэтыя дні павінны быць выкарыстаны з максімальнай прадукцыйнасцю. Трэба памятаць, што з кожным процантам плана звязана бесперабойная работа прамысловасці.

Гр. Хвазвы.

Леспрамгасаўцы капаюць бульбу

Уладзенскі леспрамгас у трэцім квартале паўгоддзя быў вывезці з лесу 430 кбм. будаўнічых матэрыялаў і 360 рафмерраў дроў. Фактычна вывезена 1234 кбм. будматэрыялаў і 278 р. м. дроў.

Што-ж рабілі працаўнікі леспрамгаса у часе абвешчанага СНК БССР двухдэкадніка. Яны на працягу пяці дзён былі заняты ўборкай сваёй уласнай бульбы, якой нямала кожны пасёлак. На ўборку было перакінута шэсць коней леспрамгаса:

— Выкапаем бульбачку, тады пацісцем на вывазку леса — гаворыць нам. дырэктар леспрамгаса Берштэйн. Ён сам на леспрамгасскіх конях тры дні працаваў на уласнай гаспадарцы.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЖАКТ

ДАПАМОЖАМ УДАРНІКАМ СПАТКАЦЬ КАСТРЫЧНІЦКІЯ СВЯТЫ Ў АДРАМАНТАВАНЫХ КВАТЭРАХ

Конкурс на лепшы жакт у перавыбнай большасці жактаў усклыхнуў пролетарскую грамадскасць. Сталінскі раён, з яго першым маршрутам за рабочае жыллё, прыдаў конкурсу яшчэ больш размах, уцягнуў новыя сотні тысячы актывістаў фабрык і заводаў, членаў жактаў, жонак рабочых і служачых. Многія праўленні жактаў зразумелі палітычнае значэнне сталінскага паходу пашырэдацці вялікага пролетарскага свята— Кастрычніцкай гадавіны, зразумелі, якую ўдзельную вагу ў гэтым паходзе мае барацьба за **здаровае жыллё**, зразумелі што асноўнай мэтай у гэтай барацьбе з'яўляецца забеспячэнне лепшымі кватэрнымі ўмовамі **ударніка вытворчасці, героя пяцігодкі.**

Большасць зводак аб ходзе конкурса гавораць аб тым, што многія ўдарнікі **спаткаюць XVI гадавіну Кастрычніка ў адрамантаваных кватэрах.** Возьмем жакт № 10 (старшыня праўлення тав. **Форын**, загадчык дамамі тав. **Бірг**). Праўленне гаржыласаюза зусім правільна занесла гэты жакт на чырвоную дошку. Праўленне жакта ўжо адрамантавала кватэры—ударніка завода імя Мясцікова тав. **Руманава** (паставілі новую кухонную печ), ударніка швейнай фабрыкі імя 8-га сакавіка—**Штэрна** (паклалі новую падлогу, зрабілі лжанку, перагародку, справілі вокны і дзверы), ударніцы фабрыкі «Кастрычнік» **Свердліной**, ударніка друкарні «Звязды» **Шульберга** і інш. Ідзе рамонт кватэр **Бурштэйна**—рабочага фабрыкі «Кастрычнік», **Абражэвіча**—шофера трансцартпрэста, **Мілашэўскай**—работніцы друкарні імя Сталіна, **Дар'еўскай**—работніцы шваліўнай майстэрні, **Шайніна**—рабочага фабрыкі «Комунарка». Усе яны ўдарнікі. Апошнія два да таго-ж героі першай пяцігодкі.

Праўленне жакта № 2 (старшыня праўлення тав. **Беркоўскі**, загадчык дамамі тав. **Гінзбург**) рамантуе кватэры ўдарніка швейнай фабрыкі імя 8-га сакавіка тав. **Мерсона М.**, ударніка друкарні імя Сталіна тав. **Нежніка**, ударніка лямцавай фабрыкі т. **Пуселя** і інш.

Жакт № 45 (старшыня праўлення тав. **Рубін**, загадчык дамамі тав. **Свірыноўскі**) рамантуе пяць кватэр ударнікаў, у тым ліку кватэру **дзерніка тав. Будзіла**, у якой пасцілае новую падлогу, спраўляе печы, ставіць новыя вакоўныя пераплёты.

Жакт № 22 (старшыня праўлення т. **Гантман**, загадчык дамамі тав. **Пячура**) рамантуе 19 кватэр, з іх 15 кватэр ударнікаў.

Жакт № 18 (старшыня праўлення т. **Дахоўкер**, загадчык дамамі тав. **Ківелевіч**) адрамантаваў ужо кватэру ўдарніцы швейнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. **Шварц**, рад кватэр яшчэ рамантуецца.

Усяго на нявоўных вестках у 30 жактах з 61 рамантуецца **119 кватэр ударнікаў** з агульнай колькасці ў 160 кватэр. Адрамантавана ўжо з 25 вестка па 18 кастрычніка **363 кватэры.**

Многія ўдарнікі атрымліваюць лепшыя кватэры, **перасяляюцца з падвалаў у лепшыя дамы.** Жакт № 1 (старшыня праўлення т. **Калусцін**, загадчык дамамі т. **Бібер**) прадставіў свабодную кватэру з двух пакояў з прыходнай і асобным ходам у доме № 15 на Плошчы Волі рабочаму завода «Большэвік», герою пяцігодкі тав. **Катляровічу.** У кватэры за кошт жакта канчаецца рамонт і поўная аддзелка. Старая кватэра Катляровіча з 2-х пакояў і кухні прадастаўляецца ўдарніку завода імя Варашылава тав. **Кандрашову.** Кватэра Кандрашова так сама рамантуецца і аддзелваецца за кошт жакта.

Жакт № 45 перагледзіў рабочага **Ліса** з падвала па Ракаўскай, 26, у кватэру па Хлебнай вул., № 8.

Гэтыя нявоўныя лічбы з выстарчальнай пераканаўчасцю сведчаць аб вялікіх поспехах першых двух дзнад конкурса. Сотні рабочых і служачых, з іх шмат ударнікаў і герояў першай пяцігодкі атрымаюць да вялікага пролетарскага свята новыя, адрамантаваныя кватэры.

Зразумела, гэтыя поспехі цікога задаволіць не могуць. У жактах застаецца яшчэ нямала рабочых сярод іх шмат ударнікаў кватэры якіх патрабуюць рамонта. Гэта паказалі спісы, прадстаўленыя ў гаржыласаюз фабзаўкомамі паводле ўказання гарпрафсавета. У спісу завода «Большэвік»—10 рабочых-ударнікаў, кватэры якіх патрабуюць тэрміновага рамонта. У спісу завода імя Варашылава — 4 чал., «Комунара»—12 чал., фабрыкі «Кастрычнік»—54 чалавекі. Іншыя прадпрыемствы спісаў не прадставілі. Што датычыць спіса завода імя Варашылава, дык ён хутчэй сведчыць аб фармальным, казённым падыходзе да гэтага пытання, чым аб сапраўдным становішчы рабочых завода. Няўжо сапраўды на заводзе імя Варашылава толькі 4 кватэры рабочых патрабуюць рамонта?

Тым не менш і прадстаўленыя спісы—асабліва фабрыкі «Кастрычнік»—даволі яркі сведчаць аб тым, што многія рабочыя кватэры ў жактаўскіх пасёлках **не ўключаны ў планы рамонтаў** у адпаведнасці з патрабаваннямі конкурса. Частка кватэр, паказаных у спісах заўкомаў, будзе адрамантавана. Жакты бяруць на сябе абавязацельства да свята закончыць рамонт. Але частка кватэр, безумоўна, **можа быць неадрамантаванай**, калі фабзаўкомы і пролетарская грамадскасць не прыйдуць жактам на дапамогу.

Ідэя шэфства прадпрыемстваў над жактамі, высушэтая месяцы тры таму назад, не знайшла яшчэ шырокага распаўсюджання. Толькі паасобныя фабзаўкомы («Большэвік», «Кастрычнік», «Чырвоны хімік») звязаліся непасрэдна з жактамі, выяўляюць сваіх ударнікаў, што жывуць у жактах, за ключаюць дагавары аб рамонце і г. д. Напрыклад, заўком завода «Большэвік» вешае, дзе жывуць рабочыя і ўдарнікі завода, у якіх кватэрах ідзе рамонт, якія патрабуюць рамонта. Заўком знадаўла ў дзень адпачынка паслаў увесь прафактыў для абследвання становішча кватэр сваіх рабочых. Для ўзмацнення кіраўніцтва над шэфнага жакта № 15 заўком завода «Большэвік» вылучыў на пасаду загадчыка дамамі ўдарніка завода тав. **Ітіна.** На заводзе створан рад брыгад у дапамогу жакту, улічаны працуючыя на заводзе будаўнічыя рабочыя і некаторыя з іх пасылаліся ўжо для аказання канкрэтнай дапамогі ў рамонце кватэр ударнікаў завода.

Прафактыў фабрыкі «Кастрычнік» знадаўла абследаў свае падшэфныя жакты №№ 50, 52 і 53.

Заўком «Чырвонага хіміка» зацікавіўся работай свайго падшэфнага жакта № 6, прымаў удзел на пасяджэнні праўлення, дагаварыўся аб перабуцове пустуючага склада ў кватэры, асігнаваўны на гэту справу некаторую суму грошай.

Сёе-тое робіць паасобныя цэхі завода імя Варашылава.

Але гэтымі некалькімі прыкладамі прыхоўзіцца абмежавацца. Фабзаўкомы іншых фабрык і заводаў Менска нічым пахваліцца не могуць. Яны ігнаруюць шэфства над жактамі, і гэтым пазбаўляюць сябе багатых магчымасцей палепшыць кватэрныя ўмовы сваіх рабочых і дабіцца хоць некалькіх кватэр для бесквацэрных.

Застаўшыяся пустары дожды да 16-й гадавіны Кастрычніка павінны ўнесці рэзкі пералом у адносінах заводскіх прафарганізацый да важнейшага пытання рабочага быта—да пытання аб палепшэнні кватэрных умоў. Пролетарскае кіраўніцтва праўленнямі жактаў, дзе склад членаў вельмі разнастайны, перанясенне ў жакты соцыялістычных метадаў палітычнай, культурна-масавай, арганізацыйнай і практычнай работы, якімі так багаты нашы перадавыя прадпрыемствы, канкрэтная дапамога людзьмі і будаўнічымі матэрыяламі— усё гэта павінна ўнесці рэзкае палепшэнне работы **саміх жактаў**, дзе колькасць недахопаў усё яшчэ пераважае вымногія дасягненні.

Конкурс на лепшы жакт павінен у такой-жа ступені цікавіць шэфаў, як і саміх жактаў, бо **першынства** па конкурсу з'явіцца **перамогай** на фронце палепшэння бытавых умоў рабочых і ўдарнікаў як прадпрыемстваў-шэфа, так і іншых прадпрыемстваў сталіцы БССР.

Прафарганізацыі павінны дапамагчы сваім ударнікам спаткаць кастрычніцкае свята ў адрамантаваных, чыстых і здаровых кватэрах.

Л.

ДРОЎ МЕНСКУ

(у вагонах і процантах)

15 кастрыч.	16 кастрыч.	17 кастрыч.	18 кастрыч.	19 кастрыч.
— / —	44 / 88	13 / 26	2 / 4	8 / 16

ФРЫЦ ГЕККЕРТ

ФАШЫСЦКАЕ АШУКАНСТВА

Трэцяя імперыя Гітлера пры трубных гуках і барабанным бае ўсяго прапагандысцкага апарата Гебельса заявіла аб сваім выходзе з Лігі нацый. Германская дзяржава ўцякае з Лігі нацый і аб вялічае аб выбарах.

Чаму патрабаваўся ўраду Гітлера выхад з Лігі нацый? Чаму ён прымушае выбіраць новы рэйхстаг, будынак якога ён сам падпаліў?

На гэтыя пытанні ёсць толькі адзін адказ. **ГЭТА — БАНКРУТСТВА ТАК ЗВАНАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ. ГЭТА — КРУШЭННЕ ЎНУТРАНОЙ І ЗАМЕЖНАЙ АВАНТУРНІЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА.**

Гітлераўцы прышлі да ўлады з дапамогай настрымнай нацыяналістычнай дэматоміі. Сваю крывавую фашысцкую дыктатуру яны агаласілі як вызваленне Германіі ад прадпісаньняцкага версальскага міра. Мільёнам беспрацоўных яны абяцалі даць работу. Селянам, рамеснікам, дробнай буржуазіі, дзяржаўным служачым яны абяцалі вызваленне ад голада, ад падаткаў, рабства, ад залежнасці ад капітала. **ЯНЫ НІЧОГА НЕ ДАЛІ.** Яны усё адабралі, што можна было адабраць, дзеля выгады прамысловых магнатаў, біржавых шакалаў і прускага юнкерства. Мілітарызм трэцяй імперыі, ідыёцкая палітыка гітлераўскай эрэі капіталалі германскім працоўным куды даражэй, чым нават невыносныя цяжары версальскага міра.

Нядоволасць фашысцкіх барбараў і дэмагогаў вызваліць Германію ад версальскага ярма выклікала ўпадак нацыянал-сацыялісцкай хвалі, аслабленне панівных нацыянал - сацыялістычнага ўрада. Банкрутства ўсіх мерапрыемстваў на прадстаўленні работы, узрастаючае абвастрэнне эканамічнага крызіса, нязгодзе бядотнае становішча ўсіх пластоў працоўных на ўсёй краіне прывяло ўрад Гітлера да край бяздоння.

На парозе зіма. Масы бачаць, што абяцаная дапамога, у сувязі з наступленнем зімы, аказваецца поўным ашуканствам.

Між тым, **МАРКСІЗМ ЖЫВЕ.** Германская жэмпартыя вядзе гераічную барацьбу, яна выкоўвае адзіны фронт шырокіх мас рабочага класа для барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры, за дыктатуру пролетарыята, за совецкую ўладу.

Знешняя-палітычнаяізаляванасць і ўнутрана-палітычная безнадзейнасць — такое становішча гітлераўскай дзяржавы, такавы прычыны ўцёкаў з Лігі нацый, жулыніцтва з выбарамі ў рэйхстаг і о народным галасаваннем. Гэтыя мапеўры павінны былі паслужыць якарам ратунку, які павінен быў умацаваць пахіснутыя пазіцыі панавання фашыстаў.

Адзінае, што да гэтага часу дасягнуў урад Гітлера — гэта было ператварэнне Германіі ва ўзброены лагер.

Але, не гледзячы на ліхаманкавае ўзбраенне, фашысцкая Германія ў цяперашні час аказваецца слабей, у параўнанні з імперыялістычнымі дзяржавамі, чым 9 месяцаў назад.

Калі 6 месяцаў таму назад урад Гітлера ягнуў быў у стане прадставіць германскай дробнай буржуазіі свой улазл у пакце чатырох, як крок да роўнаправя Германіі, то ў цяперашні час гэты пакт чатырох дзяржаў з'яўляецца толькі нікчэмным кавалачкам паперы. Калі ў той час ён мог мець ягнуў поўныя надзеі, што ў хуткім часе яму ўдасца дабіцца далучэння Аўстрыі да трэцяй дзяржавы, то цяпер усе гэтыя надзеі аказаліся дарэмнымі. Трэцяя дзяржава Гітлера стаіць зусім ізаляванна сярод капіталістычных дзяржаў.

Каб выратаваць знікаючы ўплыў нацыянал-сацыялістаў, зноў патрабаваліся распачлівыя меры. Выхад з Лігі нацый мае мэтай толькі выклікаць новую хвалю нацыянал-сацыялізма і ўзняць прэстыж урада, што знізіўся ў сувязі з лейпцыгскім працэсам. Ворагі ўсякіх выбараў абвясцілі выбары ў рэйхстаг, каб яшчэ раз выклікаць уздым нацыяналістычнай хвалі ў надзеі, што германскі пролетарыят ва ўмовах жорсткага тэрора не зможа супрацьпаставіць гэтай нацыяналістычнай вайне масавую барацьбу за пролетарскі інтэрнацыяналізм.

Працоўныя Германіі не павінны дазваляць ашукваць сябе гэтымі «выбарамі», таксама, як і выхадам з Лігі нацый і паслядоўнымі за гэтым мірнымі выступленнямі Гітлера. Яны павінны ведаць, што авантурніцкая палітыка германскага фашызма надзвычай абвастрыла становішча ў Эўропе і вядзе да непасрэднай ваеннай пагрозы. Выхад Германіі з Лігі нацый, з гэтай арганізацыі міжнароднага імперыялізма, адкліканне германскай дэлегацыі з канферэнцыі па разбраенню фашысцкім урадам з'яўляецца непасрэднай падрыхтоўкай да новай імперыялістычнай вайны.

У цяперашні час, калі «адзінства германскай нацыі» стала галоўным лозунгам фашысцкай дэмагогіі, калі масы ўцягваюцца ў правакацыю да вайны пры дапамозе выбарчай камедыі, працоўныя асабліва павінны памятаць словы Лібкнехта: **«ГАЛОЎНЫ ВОРАГ У НАС У КРАІНЕ».** Цяпер, калі фашысты пры дапамозе ўсенароднага галасавання хочуць прымусіць паверыць у афтарытарную дэмакратыю, трэба з асаблівай сілай выступіць за пролетарскую дэмакратыю, за дыктатуру пролетарыята, за ўладу совецтаў. Не гледзячы ні на што, комуністы, стоячы на чале рабочых мас, будуць скарыстоўваць кожную магчымасць, каб выкрыць фашысцкае жулыніцтва з выбарамі і каб даць магчымасць працоўным масам правіць сваю слушную волю.

Гітлераўскія выбары — гэта не выбары, іх рэзультаты не лічацца. У Германіі не можа быць выбараў, не можа быць усенароднага галасавання да таго часу, пакуль кіруе гітлераўская банда, пакуль тысячы і дзесяткі тысяч лепшых пролетарыяў пакутуюць у канцэнтрацыйных лагерах, у фашысцкіх казармах і турмах.

МОЖА БЫЦЬ ТОЛЬКІ МАСАВАЯ БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ І ЗА ДЫКТАТУРУ ПРОЛЕТАРЫЯТА. У Германіі ёсць толькі адна **АДЗІНАЯ СІЛА, ЯКАЯ МОЖА АРГАНІЗАВАЦЬ І ПАВЕСЦІ БАРАЦЬБУ — ГЭТА ПАРТЫЯ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ, ГЕРАІЧНАЯ КОМПАРТЫЯ ГЕРМАНІІ.**

ПРАВАКАЦЫЯ ЗА ПРАВАКАЦЫЯЙ

ВОДГУКІ ЗАМЕЖНАЙ ПРЭСЫ

ПАРЫЖ. (БЕЛТА).

Друк адзначае, што вакол працэса аб падпале рэйхстага пляцецца густая сетка палітычных правакацый. Паводле слоў газет, пасля высылкі замежных адвакатаў паліцыя збіралася зрабіць тое-ж самае з радам замежных журналістаў.

Толькі ўмяшанне міністра замежных спраў Нейрата, які імкнуўся ўнікнуць новага міжнароднага скандала вакол працэса, перапыніла гэтаму. Паліцыя абмежавалася арыштам галандца Віндэгэма, якому інкрымінуецца апублікаванне ў адной галандскай газеце зневажальнага для Герынга артыкула.

***

ПРАГА, 19. (БЕЛТА).

Каментуючы паведамленні аб ходзе працэса аб падпале рэйхстага, «Прагер тагеблат» падкрэслівае, што апошнія дні працэса праходзяць пад знакам узмоцненых спроб абвяргнуць факты, прыведзеныя ў «Барычневай кнізе».

Газета піша: «Калі ўважліва прасачыць метады старшыні суда, абвінавачання і нават абаронцаў, дык ствараецца ўражанне, быццам суд ідзе не пад тымі, хто сядзіць на лаве падсудных, а пад іншымі, якія ўпарта стараюцца ашукаць».

ІНТЭРВ'Ю ГІТЛЕРА

МАСКАВАННЕ ВАЕННЫХ ПЛАНАЎ

ЛОНДАН, 19. (БЕЛТА).

У інтэрв'ю з карэспандэнтам «Дэйлі мейль» Гітлер пасля звычайных сцвяр джэньку, што Германія не хоча вайны і не імкнецца да ўзбраення, заявіў:

«Ніхто ў Германіі не думае заваяваць з Польшчай з-за калідора, але нават дагавор дае прага патрабаваць перагляду існуючага становішча».

На пытанне, у якім напрамку ён ліччыць магчымым экспансію Германіі, Гітлер не даў простага адказа. Ён заявіў:

«Мы не будзем заваяваць для таго, каб атрымаць калоніі. Мы лічым гэта пытанне падлягаючым абмеркаванню ў перагаворах».

ТУРНЭ ПАПЕНА

ПАПСАЦЫЯЛІСЦКАЯ АГІТАЦЫЯ ЗА ЗВАРОТ СААРСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ПАРЫЖ, 18 (БЕЛТА).

У сувязі з прыбыццём Папена ў Саарскую вобласць, «Матэн» піша што, не гледзячы на афіцыяльную германскую заяву аб прыватным характары гэтай паездкі, Папен скарыстае сваё прабыванне ў Саарскай вобласці для актыўных перагавораў з мясцовымі нацыянал-сацыялістскімі арганізацыямі.

Паездка Папена, — піша газета, — мае на мэце ўзмацніць агітацыю за зварот Саарскай вобласці Германіі.

НА ПАРОЗЕ УРАДАВАГА КРЫЗІСА У ЯПОНІІ

АРАКІ ДЫКТУЕ СВАЕ ПАТРАБАВАННІ

ТОКІО, 19 (БЕЛТА).

Ваеннае міністэрства апублікавала «неафіцыяльнае паведамленне», якое ўказвае, што ваенны совет, які адбыўся 8-га кастрычніка, азнаёміўшыся з дакладам ваеннага міністра Араекі, аднагалосна пастанавіў падтрымаць патрабаванне Араекі на нарадах 5-ці міністраў.

У паведамленні падкрэсліваецца, што прынцыпы замежнай і ўнутранай палітыкі, вызначэнні Араекі на гэтай нарадзе, распрацаваны «сумесна з ваенным міністэрствам і генеральным штабам» і такім чынам выказваюць погляды «ўсёй арміі».

Паведамленне выклікала сенсацыю ва ўрадавых колах. У палітыках паведамленне аднадушна ацэньваецца, як адзнака абвастрэння барацьбы ў габінеце і як пацвярджэнне рашэння ваенных колаў настаяць на поўным задаваленні патрабаванняў Араекі.

«Ніці-ніці», спасылаючыся на прадстаўніка ўрада Саіто, сцвярджае, што «паведамленне ваеннага міністэрства з'явілася нечаканасцю для ўрада» і сведчыць аб намеры ваенных колаў не ісці ні на якія ўступкі па пытанню дзяржаўнай палітыкі, якія абмяркоўваліся на нарадах пяці міністраў.

Ва ўрадавых колах, паводле слоў прадстаўніка ўрада,—піша газета, — тым больш здзіўлены, што на апошняй нарадзе пяці міністраў была дасягнута прынцыповая згода аб тым, каб па ўвесь час правядзення мадэрнізацыі ўзбраенняў прымаліся дыпламатычныя меры да папярэджання «апошніх крызісаў». Вось чаму невядома, чым кіравалася ваеннае міністэрства, публікуючы «сваё паведамленне». Ва ўсякім выпадку япона, што Араекі пажадаў умацаваць сваю пазіцыю, дэманструючы той факт, што ён карыстаецца падтрыманнем генеральнага штаба і ваеннага міністэрства.

Паводле слоў «Іоміўры», паведамленне ваеннага міністэрства ўспрымаецца ва ўрадавых колах, як цяжкі ўдар і ацэньваецца як парозе таго, што ў выпадку незадаволення патрабаваннямі ваенных колаў, японскія «адмовяцца падтрымліваць урад Саіто».

«Сімбун Рэнго», спасылаючыся на аўтарытэтныя крыніцы, указвае, што, публікуючы сваё паведамленне, Араекі кіраваўся задумам абвергнуць чуткі аб «расколе ўнутры арміі» і хацеў даказаць, што ён з'яўляецца прадстаўніком у габінеце Саіто «не толькі маладога афіцэрства», але і ўсёй арміі.

Па СССР

* **1.504 ГРУЗАВІКІ і 422 ЛЕГКАВЫХ АЎТАМАБІЛІ** выпусцілі аўтазавод імя Сталіна і Яраслаўскі завод за першую палову кастрычніка.

Тры трактарныя заводы (Сталінградскі, Харкаўскі, Чалябінскі) далі за гэты-ж час **3.686 ТРАКТАРАЎ**, у тым ліку **100 МАГУТНЫХ ТРАКТАРАЎ «СТАЛІНЕЦ».** За ўвесь кастрычнік мінулага года былі выпушчаны толькі 4.452 трактары.

Лепш за ўсіх працуе **ХАРКАЎСКІ ТРАКТАРНЫ ЗАВОД, ЯКІ ДАЎ ЗА 15 ДЗЁН КАСТРЫЧНІКА 1.878 ТРАКТАРАЎ ПРЫ МЕСЯЧНАЙ ПРАГРАМЕ Ў 3.380.**

* **НОВЫ ЗАВОД** па рамонту трактараў пушчан у Ліпецку. Да вясны 1934 года новы завод капітальна адрамантуе 2.000 трактараў.

* **АДБЫЎСЯ ПУСК** карбітнага цэха на Краслінскім хімкамбінаце. Пускам гэтага цэха завяршаецца будаўніцтва ўсіх цэхаў.

* **НА 200 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ** павінны даць тавараў шырокага спажывання заводы дзяржаўнай прамысловасці. Павінна быць выпушчана ў два разы больш металёвых і электратэхнічных тавараў, чым за трэці квартал бягучага года. Асабліва ўзрастае выраб тавараў для вёскі. У чацвертым квартале будзе выраблена каля 22.000 тон металёвай гаспадарчай посуды. Заводы дадуць 142 тыс. прымусаў, 890.000 газовак, 533.000 металёвых лазаў, 486.000 неабходных для вёскі «ветравых ліхтароў», каля 300.000 металёвых ложкаў і г. д. Значна павялічваецца выраб прад метаў спорта. У гэтым квартале павінна быць выпушчана 105.000 веласіпедаў і 22.000 фотаапаратаў. Заводы дадуць 20.000 гадзіньнікаў і 810.000 ходзікаў, а таксама 135.000 будзільнікаў. Значна палепшацца снабжэнне пырокага рынка электрычнымі лампамі, якіх будзе выпушчана 14 мільёнаў штук.

* **ЗБОЖЖАСАЎГАСЫ БУДУЦЬ ПОЎНАСЦЮ ЭЛЕКТРЫФІКАВАНЫ Ў 1934 ГОДЗЕ.** У саўгасах будуць пабудаваны 86 новых электрастанцый, кожная магутнасцю ў 75-100 кілават.

* **ПАДАГУЛЕНЫ ВЫНІКІ РАБОТЫ ЗАЛАТОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ** за верасень і 9 месяцаў 1933 года. Замест звычайнага зніжэння золатаздабычы, характэрнага ў мінулыя гады для верасня, сёлета здабыча золата ў верасні значна вырасла на 83 проц. параўнальна з верасньскімі паказальнікамі мінулага года. Найлепшых вынікаў дабіўся трэст «Уралзолото», які павялічыў здабычу параўнальна з верасном мінулага года на 168 проц.

* **ЗАКОНЧАНА БУДАЎНІЦТВА І МАНТАЖ БУЙНЕЙШАЙ У СВЕЦЕ, АБСТАЛЯВАНАЙ ПАВОДЛЕ АПОШНЯГА СЛОВА ТЭХНІКІ ЦЯГАВАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ НА ГАРЫ АТАЧ.** Падстанцыя прынята з ЦЭС ток у 30.000 вольт. Электрапаязстанцыя дае ток электравозам, якія будуць транспартаваць руду з рудніка на драбільна-прамывачную фабрыку. У эксплаатацыю ўступаюць 13 магутных электравозаў.

СІРОП і ЦУКАР З КЛЁНУ

Для здавальнення ўзрастаючай патрэбы ў цукры і для экспарта можна здабываць кожны год у БССР па **26.000** тон салодкага соку з **700** тыс. клёновых дрэў.

Гэта колькасць соку, шляхам простага выпарвання пры тапным апале ў лесе, ператвараецца ў **800** тон сіропа, з якога можна атрымаць каля **500** тон цукру.

Сок здабываецца вельмі проста. У пачатку сакавіка свярдзёлкам пракручваюцца ў клёнах дзіркі дыяметрам у 1,5 см., глыбінёй у 3-4 см. у дзіркі ўстаўляюцца драўляныя жалабкі, а пад жалабкамі падстаўляецца банка з трубага зялёнага шкла, ці другая пасудзіна, ёмістасцю літраў у 4. Выцяжанне соку працягваецца каля 9 пяцідзнёвак, прычым у першую пяцідзнёўку яго выцякае ў малой колькасці і ён маласалодкі. У другую пяцідзнёўку салодкасць соку ўзрастае; адно дрэва дае яго ў сярэднім па ¼ літра за суткі. У трэцюю пяцідзнёўку салодкасць узрастае яшчэ больш і некаторыя клёны даюць ужо соку па 6 літраў у суткі. У чацвертую, пятую і шостую пяцідзнёўкі выдзяленне соку змяншаецца ў сярэднім да 0,5 літра ў суткі з дрэва; а ў 7-8 пяцідзнёўкі паніжаецца да 0,08-0,2 літры ў суткі. З памяншэннем выдзялення соку змяншаецца і яго салодкасць і вельмі пагаршаецца якасць. Так што практычна сок выгадна здабываць у 2-6-ю пяцідзнёўкі і асабліва ў 3-ю пяцідзнёўку; салодкасць соку ў гэтай пяцідзнёўцы каля 2 проц.

З пацяпленнем наступаючым пасля папярэдняга пахаладнення, выцяжанне соку павялічваецца, але часта гэтае па вялічэнне супадае з паніжэннем тэмпературы.

Таўстыя клёны даюць больш соку. Пры чым даныя даследвання гаворадь, што пры ўдвая большай колькасці пчыёлін на дрэве, выхады соку павялічваюцца на 40 проц.

Па сканчэнні сезона пчыёліны павінны быць забіты драўлянымі ўтулкамі са смалой. Практыка паказала, што гэта дрэву не шкодзіць.

Выпарваць сок можна на спецыяльных апаратах з гафрыраваным дном, а таксама ў вялікіх лужаных жалезных каробках, размешчаных у рад на доўгай печы, але ў такіх каробках выпарванне ідзе больш марудней, затое пабудаваць такую печку можна ў любым лесе. Без асаблівых перасыпрог сок можна выпарваць да 1-15 яго аб'ёма. Пры гэтым трэба ўважліва сачыць за раўнамернасцю направання, каб сок, згусціўшыся ў сіроп, не падгараў. Пры недаварванні і колькасці цукру ў сіропе менш 64 проц., сіроп хутка псуецца, з прычыны пасялення ў ім мікраарганізмаў, а пры перавараванні з цукрам больш чым 67 проц. сіроп губляе смак. Нармальна выраблены сок пры салодкасці яго ў 64-67 проц. мае добры смак, залацісты колер і кансістанцыі свежага мёду. Гэта высокагатунковы сок. Хаваць яго трэба ў чыстай, добра заткнутай пасудзіне ў прохладзі і цёмным месцы.

Красуцкі і Емельянаў.

СЕННЯ 21-га КАСТРЫЧНІКА НА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б РЭДАКЦЫІ „ЗВЯЗДА"

ПЕРСАНАЛЬНУЮ ЧЫСТКУ ПРАХОДЗЯЦЬ

т.т. ЧАРНЯКОЎ, ЭПШТЭЙН, ЭСТРЫН, ШАЎДРУК, ГАРБУНОЎ ДЗЕРАХ, ГОХМАН, РОЛЬБІН, ХМЕЛЬ, ЕРМАКОЎ.

Чыстка адбываецца ў памяшканні Дома пісьменніка (Совецкая, дом № 68) з 9 гадзін раніцы да 1-й гадзіны дня. Просьба да ўсіх рабочых, служачых і працоўных Менска прыняць актыўны ўдзел у чыстцы.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

На бягучым рахунку 1.047.203 рублі

За 20 кастрычніка на бягучы рахунак № 160-7814 паступіла 19.498 руб. 72 кап. Ад арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў горада Менска—7.911 руб. З раёнаў: **Дзяржынскага**—604 руб., **Полацкага**—3.197, **Сенненскага**—2.200, **Талачынскага** — 380, **Церахаўскага**—1.104, **Сіроцінскага**—605, **Хойніцкага**—390, **Чавускага** — 700, **Мсціслаўскага**—155, **Лёзненскага**—321, **Лепельскага**—1.000, **Клічаўскага**—132, **Жлобінскага**—341, **Мазырскага**—453.

Усяго на бягучым рахунку лічыцца 1.047.203 рублі.

Парыцкі раён адстае

У Парыцкім раёне вельмі слаба праходзіць кампанія збора сродкаў на пабудову авіяэскадрыльі імя тав. Кагановіча. Асабліва аслабленае адчуваецца ў апошні час Радсельсоветаў (Малінаўскі, Ламавіцкі, Шчадрынскі, Сіцкі, Рамаўцкі і інш.) не сабралі яшчэ ні адной капейкі. Ніякай масавай работы ў калгасах не праводзіцца. За другую пяцідзнёўку кастрычніка па раёну сабраны ўсяго толькі 456 руб. Раённыя арганізацыі недаацэньваюць важнасці кампаніі і не кіруюць ёю.

Уносяць і выклікаюць

* На выкліку тав. Вакмана ўнёсшу 15 руб. на пабудову эскадрыльі імя т. Кагановіча і выклікаю т. **Сакалоўскага, Ківовіча, Мінкова, Драгелева, Карначука, Перкіна, Айзенсона і Каца.**

Вайсман.

* На выкліку т. Я. Паўлоўскага ўнёсшу 15 руб. і выклікаю т. т. **Рабінозіча** (Полацак); **Іоффе** (Хойнікі); **Дамброўскага** (Петрыкаў); **Дашкевіч** (карэспандэнт «Звязды» ў Рэчыцы); **Рыжыкава і Кацнельсона** (рэчыцкі РК КП(б)Б).

Кузняцоў.

Прад'яўляем рахунак радыёаддзелу

РАБОЧЫЯ КЛУБЫ І ДАМЫ 2-х НОВЫХ ГІГАНТАЎ ПАЗІННЫ БЫЦЬ РАДЫЁФІКАВАНЫ

Касцюкоўская гута і Крычаўскі цэмэнтны завод — гэта дзве буйнейшыя вытворчыя адзінкі ў БССР. Яны ўжо ўступілі ў пускавы перыяд.

Задача ўсіх работнікаў фронта культурнай рэволюцыі — аказаць усямерную дапамогу, арганізаваць культурнае і матэрыяльнае абслугоўванне тысяч рабочых новых заводаў. Пачалі і мы, работнікі радыёкамітэта, што колечы ў гэтым напрамку рабіць. Мы падрыхтавалі і на ўсёй БССР перадавалі спецыяльныя перадачы, прысвечаныя гігантам будоўлі, людзям-героям.

Але нас работы Крычаўскага і Касцюковіцкага гігантаў не слухаюць. На гэтых двух новых будоўлях — няма радыёвузлоў, няма ніводзнай радыёгрэмкі. Між тым, рашэнне партыйных і ўрадавых органаў вызначана першачарговасць радыёфікацыі ўпарных пасёлкаў. Радыёаддзел пры Наркамаце сувязі адмахвацца ад гэтай работы.

Мы ўпэўнены, што «Звязда» дапаможа, і рабочыя 2-х новых гігантаў да XVI гадавіны Кастрычніка будуць слухаць радыё.

Аддзел масава - палітычнага вяшчання радыёкамітэта.

Паведамленні

Сёння, 21 кастрычніка, у 4 гадзіны дня пачынаецца чыстка парт'ячэйкі кліцярадка.

ПРАВЕРЬОМ.
БЮРО ЯЧЭЙКІ.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б 21-X—33 года, у 3 т. дня, у памяшканні ЦК, пакой 34, склікае нараду па пытанню рэалізацыі рашэнняў бюро ЦК па Горацкаму бістытуту. Выклікаюцца наступныя т. т.: ЦАРОНАК (БКС), КАРНАЧОЎ (Наркамсобаб), ПЭНЦЫШЭР (К-т заатэхнікі), СВОЙСКІ (К-т аўтаў), СЯМЕНАЎ (Белжаадаль), БЕНЕК, ПРАКОПЧЫК (Наркамзем), ВАСЕРМАН (Белпажрэбсаюз), ГУЛЬКІНА (Белжаапхарэ), СІЛЬВЯСТРАЎ (НК аховы здароўя).

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б.

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 25 кастрычніка, у 10 г. раніцы, у Менску (ЦНК, Совецкая, 55) будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы менскай гаркамісіі па чыстцы наступных таварышоў:

Гутэрмана А. Я., Дуброўскага В. С., Худзіна Г. Э., Верабейчыка Н. Е., Марганштэрна М. С., Лапата Х. І., Козеля Е. Г., Эйга Г. Л., Кліонскай Ф. Я., Віленчыка Р. Л., Кантаровіча М. Ш., Розенберга Д. А., Ігнацэнка А. Ц., Волкова С. А., Шкляра А. І., Кундо К. П., Каплана М. М., Копгрода Л. Я.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

***

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што 22-га кастрычніка г. г., роўна ў 1-й гадзіне дня адбудзецца **нарада трыкутнікаў** усіх прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менска па пытанню падрыхтоўкі да правядзення кастрычніцкіх свят.

Нарада адбудзецца ў вялікай залі дома комасветы (вход з вул. Карла Маркса).

Яўка абавязкова.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

„Чырвоная Зірка" Каса—ад 1 г. дня. Замежны фільм **ЯКІ З ДВУХ?**

Кіно Інтэрнацыянал. Замежны фільм **БАНДЫТКА**

Кіно „Пролетарый" Замежны фільм **КЛІНОК КЕРСТЭНБРУКА**

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр **ДВА ДРУГА МАДЭЛЬ І ПАДРУГА** камедыя ў 7 частках

„СПАРТАК" Каса з 4-х гадзін дня. Усходні мастацкі фільм **ПЕРШАЯ І АПОШНЯЯ** драма ў 7-мі частках

Гароднінзабульбяны трактарацэнтр

абвяшчае набор у рагачоўскую трактарную школу

на аддзяленні: старшых механікаў для МТС і МТМ, участковых механікаў, механікаў па с.-г. машынах і брыгадзіраў трактарных атрадаў. Тэрмін навучання: старшых механікаў—2 гады, участковых механікаў—1 год, механікаў па с.-г. машынах—1 год і брыгадзіраў-трактарыстаў—8 месяцаў. На ўсе аддзяленні прымаюцца асобы ад 18 год, маючыя асвету не ніжэй 6—7 груп, і стаж работы па трактарнай справе не менш аднаго года. Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, а таксама сталоўкай і інтэрнатам. Заявы і дакументы накіроўваць да 28 кастрычніка па адрасу: г. Рагачоў, трактарная школа. Заняткі пачнуцца 1-га лістапада г. г.

Сэктар кадраў ГБТЦ.

На падставе пастановы СНК БССР ад 11:X-33 г. № 1603

дарэкцыя Белкаапсаюза,

У сувязі з пераходам у аддзел рабочага снабжэння (АРС) Гарподвартранса

ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прэтэнзіі павінны быць прад'яўлены да 1 лістапада 1933 г. ліквідкому дарэкцыі. Пасля ўказанага тэрміна прэтэнзіі прымацца не будуць.

Ліквідком.

Бабруйская аўтаманцёрная школа дарбудвуча

паўторна даводзіць да ведома ўсіх асоб падаўшых свае дакументы для паступлення ў названую школу ў асенні прыём гэтага года, што **у сувязі з рэарганізацыяй гэтай школы ў курсавую базу** усе дакументы ў верасні месяцы г. г. былі накіраваны Гомельскаму аўтадарожнаму тэхнікуму, а таму асобы, жадаючыя атрымаць свае дакументы, павінны звярнуцца ў гэты тэхнікум па наступнаму адрасу: г. Гомель, Совецкая вул., № 75, аўтадарожнаму тэхнікуму.

ДЫРЭКЦЫЯ.

25 кастрычніка, роўна ў 7 г. веч., у памяшканні клуба імя VII з'езда прафсаюзаў (рог Комуністычнай і Энгельса)

адбудзецца

па-зачарговы пленум Бел. МБІТ'а

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1. Становішча работы Бел. МБІТ і чарговыя задачы ІТР (даклад УсеМБІТ УсеЦСПС).
2. Выбары прэзідыума Бел. МБІТ.

Паведамленне Францыі пленуму там-жа, у 6 гадз. вечара.

Прадстаўнікам секцыі ІТР з'явіцца за атрыманнем запрашальных білетаў у ЦСПСБ (2-гі паверх, пакой 11) ад 10 да 5 гадзін.

АРГ. КАМІСІЯ ЦСПСБ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА ШТОДЗЯННЫ ЖУРНАЛ

„БОЛЬШЕВИСТСКАЯ ПЕЧАТЬ"

Журнал ЦК УсеКП(б)

Журнал разлічан на партыйны актыў, работнікаў культпропаў і работнікаў рэспубліканскіх, краявых, абласных і гарадскіх газет, выдавецтваў і журналаў.

Задача журнала: кіраўніцтва друкам і дапамога ў рабоце газет журналаў, выдавецтваў.

Асноўны змест: пытанні партыйнага кіраўніцтва друкам, агляды, друку і распрацоўка розных пытанняў работы газет, журналаў (форма і метады масавай работы газет, пытанні падрыхтоўкі кадраў, пытанні сеткі і тэматычных планаў мясцовых выдавецтваў і г. д.).

Для рэдакцый рэспубліканскіх, краявых, абласных і гарадскіх газет будзе выпускацца **спецыяльная ўкладка артыкульных матэрыялаў для выкарыстання газетамі.** Змест укладкі:

а) артыкулы, якія растлумачваюць важнейшыя пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК;

б) прапагандысцкі матэрыял па вузлавых пытаннях палітыкі партыі, па пытаннях гісторыі, стратэгіі і тактыкі большэвізма.

в) асноўныя матэрыялы для правядзення найбольш важнейшых гістарычных дат і кампаній.

г) артыкулы аб важнейшых падзеях міжнароднага жыцця.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА НА ЖУРНАЛ:
На год—18 р., на 6 мес.—4 р.60 к.

Падпісная плата на журнал з укладкай:
Для рэспубліканскіх, краявых і абласных газет:
На год—1.800 руб., 6 месяцаў—900 руб.
Для гарадскіх газет: на год—600 руб., на 6 месяцаў—300 руб.
Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях Совецкага саюза і ў лістаносцаў.
Адрас выдавецтва: Масква 7, Сушчэўская 21, выдавецтва ЦК УсеКП(б) „Крестьянская газета".
Адрас рэдакцыі: Масква 7, вул. Комінтэрна, 9.

„ТЕХСО"—КАРТАТЭКА ПА ТЭХНІЧНАМУ АБМЕНУ ВОПЫТАМ—

сістэматызуе і апублікоўвае весткі аб навейшай замежнай тэхніцы, аб дасягненнях лепшых прадпрыемстваў, аб работах навукова-даследчых інстытутаў і

З'ЯЎЛЯЕЦЦА АПЕРАЦЫЙНАЙ ПЕРАСОВАЧНАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯЙ,

прадстаўляючай сабой, дзякуючы сваёй пабудове па алфавітна-прадметных рубрыках, незаменнага дапаможніка

ІНЖЫНЕРА, ТЭХНІКА, ВЫНАХОДЦЫ, МАЙСТРА, РАБОЧАГА,

якія знойдуць у ёй у арганізаваным в'дзе ўвесь вытворча-тэхнічны, канструктарскі і вынаходніцкі вопыт совецкіх і замежных прадпрыемстваў.

Увесь матэрыял разбіваецца на 86 серый.

ПА АСНОЎНЫХ ГАЛІНАХ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

Картатэка „ТЕХСО" выдаецца Цэнтральным інстытутам тэхніка-эканамічнай інфармацыі і сацыялістычнага абмена вопытам ЦИТЭИН—СО Наркамцяжпрама.

Патрабуйце падрабязныя праспекты, звяртаючыся па адрасу: Управление сбыта ЦИТЭИН—СО, Москва 64, Садовая-Земляная пер, д. № 47 і ў яго філіялы і прадстаўніцтвы на месцах.

НЕ ЧАКАЙЦЕ апошніх дзён ПАДПІСКІ

НА ГАЗЕТЫ:
„ЗВЯЗДА" Орган ЦК і Мен. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
„ОРКА" (на польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б,
„РАУДОНАСІС АРТОЯС" (на літоўскай мове) Орган ЦК КП(б)Б

НА ЧАСОПІСІ:
„БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ" Орган ЦК КП(б)Б.
„БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК" Часопіс культпропа ЦК КП(б)Б.
„Работніца і калгасніца БССР" Выданне ЦК КП(б)Б.

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО СВАЯЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЙНАЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСЯЎ

Апошні тэрмін прыёма падпіскі на лістапад—26 кастрычніка.

Пасля гэтага тэрміна падпіска ні ў якім разе прымацца не будзе

СПЯШЫЦЕ ПАДПІСАЦЦА!

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: **МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ** (Ленінская, 34, другі паверх) у гарадох—**ГАРБЮРО САЮЗДРУКУ** і раёнах—**РАЙБЮРО САЮЗДРУКУ.** Таксама тыражныя работнікамі саюздруку, лістаносцамі, якія маюць на гэта пасведчанне і ўсімі кіёскамі па продажы газет.

Увазе райКК-РСІ і актыва РСІ

Партвыдатам выдаецца журнал

„ЗА ТЕМПЫ, КАЧЕСТВО, ПРОВЕРКУ"

Орган ЦКК-НК РСІ

Адказны рэдактар **Ем. Краснаўскі**

ЖУРНАЛ з'яўляецца кіруючым органам ЦКК-РСІ, органам масавага пролетарскага кантролю.

ЖУРНАЛ мабілізуе ўвагу мас на праверку выканання пастаноў партыі і ўрада, на паляпшэнне работы дзяржаўнага, гаспадарчага і кааперацыйнага апаратаў.

ЖУРНАЛ асабліва ўвагу аддае прыцягненню мас да кіравання дзяржавай і барацьбы з бюракратызмам.